Камуністычная партыя (большэвікоў) Беларусі

ЗВЯЗДА

Орган ЦК і МК КП(б)Б, ЦВК і СНК БССР

№ 249 (5082)
ЛІСТАПАДА
5
ПАНЯДЗЕЛАК
1934 г.
год выдання XVII

Пролетарыі ўсіх краін, злучайцеся!

ВЕРНАМУ СТРАЖУ НАШАЙ ВЯЛІКАЙ РАДЗІМЫ

Цэнтральны Камітэт Комуністычнай партыі большэвікоў Беларусі шле большэвіцкае прывітанне выпускнікам-камандзірам, усяму складу курсантаў і начскладу Аб'яднанай Беларускай вайсковай школы імя М. І. КАЛІНІНА.

Школа за 14-гадовае існаванне падрыхтавала тысячы камандзіраў з высокай ваеннай і палітычнай падрыхтоўкай з рабоча-сялянскай моладзі Беларусі і з'яўляецца кузняй высококваліфікаванага камандзіра-большэвіка, бязмежна адданага справе Леніна-Сталіна, гатовага ў любую мінуту аддаць сілы і сваё жыццё за свяшчэнную недатыкальнасць межаў нашай вялікай бацькаўшчыны.

ЦК КП(б)Б упэўнен, што выпускаемыя камандзіры і ўвесь склад школы з гонарам апраўдаюць ускладзеныя на іх партыяй і совецкай уладай задачы і з яшчэ большай упартасцю і энергіяй будуць умацоўваць магутнасць і славу нашай роднай Рабоча-Сялянскай Чырвонай арміі.

Няхай жыве наш вялікі СТАЛІН!
Няхай жыве Рабоча-Сялянская Чырвоная армія — магутны аплот мірнай палітыкі совецкай улады, зоркі вартавы совецкіх межаў, верны страж нашай вялікай радзімы!
Няхай жыве лепшы праваадыр лепшай у свеце арміі — тав. ВАРАШЫЛАЎ!

ЦК КП(б)Б.

ДАСТОЙНА СУСТРЭНЕМ З'ЕЗДЫ СОВЕТАЎ

Тры гады прайшло з часу X з'езда советаў. За гэты час Совецкая Беларусь, як неадлучная частка вялікага СССР прарабіла вялікі шлях. Каму невядома, што к моменту склікання X з'езда советаў БССР цягнулася ў хвосце рэспублік Саюза па ўсіх без выключэння паказальніках. Які мы ўчастак социялістычнага будаўніцтва не вазьмем: калектывізацыю, выкананне абавязацельстваў перад дзяржавай, выкананне промфінплана — ўсюды ў мінулым было адставанне БССР ад іншых рэспублік Совецкага Саюза.

Рашаючыя прычыны адставання былі закладзены ў метадах работы партыйных і совецкіх арганізацый, у стылі кіраўніцтва.

Астатні контрреволюцыйнай нацдэмаўшчыны, нацыянал-апартунізма, прапешы ў совецкі і часткова ў партыйны апарат, падрывалі ўсю работу. Школьнікі рад галоў беспакаранне працавалі на важнейшых участках. З гэтымі астаткамі нацдэмаўшчыны не вялася рашучая большэвіцкая бязлітасная барацьба. Кулацтва, аказваўшае шалёнае супраціўленне разгорнутаму наступленню социялізма, таксама не заўсёды атрымлівала належны адпор. Больш таго, у радзе партыйна-совецкіх арганізацый адкрыта патакалі супраціўленню класавага ворага і яго агентуры, або праяўлялі гнілы лібералізм, як гэта асабліва ярка адзначаецца ў перыяд загатовак 1932 года.

Метады кіраўніцтва не адпавядалі тым патрабаванням, якія прад'яўляла партыя. Пераважала дэкларатыўнасць, парадная шуміха, канцылярска-бюракратычныя метады кіраўніцтва. У самой КП(б)Б мелі месце элементы групоўшчыны, сямейнасці, месніцтва, і з гэтым злом не вялася дастатковая настойлівая большэвіцкая барацьба.

Усё гэта прывяло да таго, што КП(б)Б дапусціла цэлы рад памылак у практычным правядзенні ленінскай нацыянальнай палітыкі, а таксама і ў пытаннях кіраўніцтва прамысловасцю і сельскай гаспадаркай, на што ЦК ВКП(б) своечасова і з большэвіцкай прозорлівасцю ўказаў КП(б)Б і яе ЦК.

За гэтыя тры гады прароблена велізарная работа. Сёння ў «Звяздзе» мы прыводзім рад арыіх, надзвычай паказальных лічбаў і прыкладаў, характарызуючых бурны рост і размах будаўніцтва. Як у прамысловасці, так і ў сельскай гаспадарцы ў наяўнасці буйны росквіт эканомікі і культуры Совецкай Беларусі.

Ажыццяўляючы ўказанні ЦК ВКП(б) і т. Сталіна, выпраўляючы дапушчаныя памылкі і недахопы ў рабоце, КП(б)Б і яе ЦК на чале з выпрабаваным большэвіком т. ГІКАЛО дабіліся таго, што БССР СТАЛА Ў РАДЫ ПЕРАДАВЫХ РЭСПУБЛІК у Совецкім Саюзе, стала саправодным социялістычным фарпостам на рубяжы з капіталістычным Захадам.

Чаго мы дабіліся за гэты, параўнальна кароткі адрэзак часу?

У галіне прамысловасці пабудаваны за гэтыя тры гады і ў аснову ім асвоены звыш 16 фабрык і заводаў, якія абсталяваны па апошняму слову тэхнікі, прычым частка з іх мае не толькі ўсесаюзнае значэнне, але па свайму абсталяванню, па сваёй магутнасці як напрыклад, шклозавод імя Сталіна, Магілаўская шаўковая фабрыка і інш., стаяць іх у рады лепшых еўрапейскіх прадпрыемстваў.

Наша прамысловасць няўхільна ідзе ўперад па выкананню промфін плана. Беларусь — тарфяны Данбас. За гэтыя гады яна дабілася таго, што асвоіла рэкордную выпрацоўку торфу ў 1.367 тыс. тон, упяршыню ў гэтым годзе перавыканаўшы вытворчую праграму па здабычы торфу.

Социялістычна перабудоўваецца беларуская вёска. На 1 кастрычніка калектывізацыяй ахоплена 81,2 проц. усіх сялянскіх двароў. Апошні год два асабліва значны прыліў у калгасы.

З поспехам выконваецца першая і асноўная запавядзь перад дзяржавай — выкананне абавязковых паставак. У гэтым годзе датэрмінова выкананы план хлебапаставак, бульбапаставак, заканчваюцца паставкі мяса. Выкананы планы па зябліву, ізаляванню і т. д. Мабілізаваны ўсе сілы на датэрміновае выкананне льнозагатовак. З года ў год мы стаім крутчэй і лепш. У гэтым годзе веснявая сяўба закончана на 35 дзён раней чым у мінулым годзе, а ў мінулым годзе на месяц раней, чым у 1932 годзе.

За гэты час выхаваны і вырасчаны новыя індустрыяльныя кадры рабочых, пік якіх дасягае звыш 100 тыс. чалавек.

Пролетарыят стварыў сваю ўласную выдатна-тэхнічную інтэлігенцыю. Давольна сказаць, што за гэтыя тры гады ў прамысловасць прыйшло звыш 3.000 інжынераў і тэхнікаў, падрыхтаваных у нашых навучальных установах нашымі выкладчыкамі-спецыялістамі.

На базе магутнага размаху эканамічнага будаўніцтва небывалы росквіт атрымала і культура нацыянальная па форме і социялістычная па зместу. Зараз у Беларусі ёсць 29 ВНУ і ВТНУ, звыш 80 тэхнікумаў. Узрасла колькасць вучняў у ніжэйшай сярэдняй школе з 660 тыс. чалавек у 1930 годзе да 853 тысяч у бягучым. Вырасла пролетарская совецкая літаратура, кіно, тэатры. Вырасці тыражы нашых газет. Ліквідавана няграматнасць. БССР адной з першых рэспублік у Саюзе ўвяла ў 1933 годзе ўсеагульнае пачатковае навучанне. Дзецішча Окцябрскай рэвалюцыі — Акадэмія Навук значна палепшыла сваю работу. Ачысціўшыся ад нацыянал-дэмакратаў, апартуністаў, яна становіцца сапраўдным цэнтрам навуковай мыслі Совецкай Беларусі.

Поспехі БССР на фронце сельскай гаспадаркі, на іншых участках социялістычнага будаўніцтва настолькі значныя, што калі мы не самасупакоімся на апошнім завяршаючым этапе сельскагаспадарчага года, то мы маем усе магчымасці закончыць год у піку перадвікоў — ордэнаносных Маскоўскай вобласці, Горкаўскага края і Крымскай АССР, і дабіцца для БССР вышэйшай узнагароды — ордэна Леніна.

Нашым поспехам мы абавязаны ленінскаму кіраўніцтву ЦК ВКП(б) і асабіста тав. СТАЛІНУ.

ЦК ВКП(б) своечасова і з большэвіцкай рашучасцю ўскрываў памылкі і недахопы ў нашай рабоце, дапамагаў нам выпраўляць іх і гэта іменна забяспечыла поспех.

Геніяльнейшы правадыр нашай партыі тав СТАЛІН у сваёй прамове аб рабоце ў вёсцы даў непраўзойдзеную па глыбіні праграму нашай работы.

Мудрае ленінскае кіраўніцтва ЦК ВКП(б) у сваіх рашэннях аб правядзенні нацыянальнай палітыкі ў Беларусі ўскрыла недахопы і памылкі ў КП(б)Б. У гэтых рашэннях прама ўказвалася на новыя манеўры і тактыку класавага ворага, які праводзіць сваю антысовецкую работу пад фальшывым нацыянальным сцягам, на факты гніпаліберальных адносін да класава-чужых элементаў. Іменна барацьба за рэалізацыю гэтых рашэнняў стала цэнтральным адпраўным пунктам за ўсёй рабоце КП(б)Б за гэтыя гады.

Нашым поспехам мы абавязаны іменна таму, што ЦК КП(б)Б няўхільна, паслядоўна ЗМАГАЎСЯ ЗА ПРАКТЫЧНАЕ АЖЫЦЦЯЎЛЕННЕ ГЕНЕРАЛЬНАЙ ЛІНІІ ПАРТЫІ, ЗА ЛЕНІНСКА-СТАЛІНСКУЮ НАЦЫЯНАЛЬНУЮ ПАЛІТЫКУ ЗА СТАЛІНСКІ СТЫЛЬ РАБОТЫ. ПОСПЕХІ БССР — ГЭТА ПЕРАМОГА БОЛЬШЭВІЦКІХ СТАЛІНСКІХ МЕТАДАЎ КІРАЎНІЦТВА.

Разгромлены астаткі контрреволюцыйнай нацдэмаўшчыны. Нанесен сакрушальны ўдар кулацкім элементам, прабаваўшым сарваць калгаснае будаўніцтва, прабаваўшым весці падрыўную контрреволюцыйную работу.

КП(б)Б і яе ЦК абвясціла непрымірымую барацьбу славянскай дэкларацыйнасці, канцылярска-бюракратычным метадам кіраўніцтва, бязлітасна выкрывала і разбівала гніла-ліберальныя адносіны да класава-чужых элементаў і іх агентуры. На аснове разгортвання большэвіцкай крытыкі і самакрытыкі, не зважаючы на асобы, выкрываліся ўсякія элементы вяльможных, саноўна-панскіх адносін да работы.

Непрымірымая барацьба з усякага роду праяўленнямі сямейнасці, групоўшчыны, мабілізацыя ўсёй КП(б)Б на барацьбу за генеральную лінію партыі, БОЛЬШЭВІЦКАЕ ІДЭЙНАЕ ЗГУРТАВАННЕ РАДОЎ КП(б)Б ВОКАЛ ЛЕНІНСКАГА ЦК І ПРАВАДЫРА ПАРТЫІ ТАВ СТАЛІНА — ВОСЬ ШТО БЫЛО ПАСТАЎЛЕНА Ў ЦЭНТРЫ ЎВАГІ.

Прайшоўшыя тры гады — гэта гады ўпартай барацьбы за ідэйнае згуртаванне КП(б)Б за вычышчэнне яе ад усякіх апартуністычных, нацыяналістычных чужых, прымазаўшыхся да партыі элементаў за выхаванне і выпучэнне беларускіх большэвіцкіх кадраў, за умацаванне низавога і раённага звяна шляхам пасылкі ў раёны соцень цэнтральных работнікаў, а ў сельсоветы і калгасы — тысяч раённых работнікаў. Гэта дало нам магчымасць умацаваць раён, сяло выпучыць новыя слаі актыва, згуртоўваць і выхоўваць іх на аснове генеральнай лініі партыі.

Велізарную ролю ў згуртаванні КП(б)Б яе вычышчэнні ад чужых, прымазаўшыхся элементаў адыграла чыстка радоў КП(б)Б.

Поспехі велізарны, але было-б найвялікшай памылкай лічыць, што ў нас ужо ўсё зроблена, што мы можам пачывать на лаўрах. У наяўнасці яшчэ нямала адстаючых участкаў — прадпрыемстваў, калгасаў, саўгасаў. І вось на гэтыя адстаючыя участкі павінна быць звернута ўся ўвага. Задача заключаецца ў тым, каб выраўнаць увесь фронт, каб не было ні аднаго адстаючага участка, каб к XI з'езду советаў прыйсці шчэрым большэвіцкім поспехам.

Перавыбары советаў павінны быць скарыстаны для іх умацавання знізу дагары, для падняцця іх аўтарытэту, для ўцягнення новых тысяч і дзесятнаў тысяч рабочага і калгаснага актыва, для мабілізацыі вытворчай актыўнасці мас.

Дастойна сустрэнем усебеларускі і ўсесаюзны з'езды советаў!

ДА ЧАРГОВАГА ВЫПУСКУ СЯРЭДНІХ КАМАНДЗІРАЎ АБВШ імя М. І. КАЛІНІНА

БОЛЬШЭВІЦКАЕ ПРЫВІТАННЕ НОВАМУ АТРАДУ КАМАНДЗІРАЎ РСЧА!

ЗА КАМАНДЗІРА-БОЛЬШЭВІКА

Нач. АБВШ імя М. І. Калініна тав. АЛЕХІН.

7 лістапада, у дзень святкавання XVII гадавіны пролетарскай рэвалюцыі, Аб'яднаная беларуская вайсковая школа імя М. І. Калініна праводзіць свой чарговы выпуск сярэдніх камандзіраў.

Беларуская ваенная школа існуе 14 год і за сваё існаванне яна выпусціла тысячы камандзіраў, адданых партыі Леніна-Сталіна. Пройдзены за гэтыя 14 год шлях школы ёсць шлях гераічнай работы не толькі на ваенна-навучальным фронце, але і на фронтах грамадзянскай вайны, дзе курсанты школы даказалі, што яны з'яўляюцца сапраўднымі байцамі-рэвалюцыянерамі. Доказам гэтага служаць чырвоныя баявыя сцягі, якія знаходзяцца ў школе.

За час свайго існавання школа выпусціла рад камандзіраў, якія зараз займаюць самыя высокія пасты ў Чырвонай арміі.

У самой школе ў цяперашні час знаходзяцца камандзіры, якія скончылі школу прайшлі праз ваенныя часці і зноў вярнуліся ў школу ўжо ў якасці выхавальнікаў тых, якія толькі рыхтуюцца стаць камандзірамі.

Беларуская школа папаўняецца курсантамі з фабрык, заводаў і калгасаў Беларусі. Знаходзячыся ў школе, гэтыя былы рабочыя і калгаснікі не парываюць з вытворчасцю. Штогодныя водпускі асабліва шырока скарыстоўваюцца для партыйна-масавай работы сярод працоўных БССР.

Сам навучальны працэс і адпачынак курсанта шырока насычаецца экскурсіямі ў музеі, тэатры, на фабрыкі, заводы і ў калгасы.

У штодзённым жыцці ў сваёй рабоце школа карыстаецца выключнай увагай і клопатамі Цэнтральнага Камітэта партыі і ўрада Беларусі. Асаблівыя поспехі, школы за апошнія некалькі год, якія далі ёй магчымасць выйсці ў лік перадавых школ РСЧА, неабходна ў першую чаргу аднесці за кошт гэтай увагі.

У цяперашні час перад школай, як і ўсёй арміяй, стаяць асабліва адказныя задачы. Школа павінна рыхтаваць высококваліфікаваных камандзіраў, выхавальнікаў сваіх байцоў. Школа павінна выхоўваць байца-комуніста, які моцна стаіць за генеральную лінію партыі і штодзённа яе праводзіць на практычнай рабоце, паспяхова прасоўваючы ўперад справу Маркса-Леніна-Сталіна ў чырвонаармейскае асяроддзе. Толькі пры гэтай умове можна арганізаваць масу на высокія паказальнікі ў баявой і палітычнай падрыхтоўцы, толькі пры гэтай умове можна павесці яе ў бой.

Праграма школы па социяльна-эканамічнаму цыклу забяспечвае курсантам магчымасць выканаць гэту задачу, а выкладчыцкі склад школы дастаткова падрыхтаваны для таго, каб гэту праграму курсантам падпесці.

Камандзір павінен быць добра ваенна-адукаваным чалавекам, ведаць сучасную ваенную тэхніку і ёю кіраваць. Лозунг правадыра нашай партыі тав Сталіна «Большэвікі павінны авалодаць тэхнікай» з'яўляецца самым папулярным лозунгам у школе. Без гэтага немагчыма ўсебакова поўнасцю скарыстаць усю тую розастайную тэхніку, якую атрымала і атрымае наша Чырвоная армія. Без гэтага камандзір і баец цяпер пакінуты.

Выпускнік павінен мець моцную аснову агульнаадукацыйнай падрыхтоўкі. Ён павінен ведаць асноўную мастацкую літаратуру, разбірацца ў мастацтве. Для гэтага ў школе створаны ўсе ўмовы — падабраны выкладчыцкі склад, у бібліятэцы налічваецца дзесяткі тысяч тамоў мастацкай і спецыяльнай літаратуры, для гэтага праходзіцца спецыяльны агульнаадукацыйны цыкл.

Ваенком АБВШ імя М. І. Калініна тав. ШАДУРО.

Выпускнікі гэтага года з'яўляюцца самымі падрыхтаванымі за апошнія гады.

Сярод выпускнікоў абсалютны пропант партыйцаў. Сярод іх шмат таварышоў, якія знаходзіліся да школы на адказнай партыйнай і грамадзкай рабоце. Многа сярод іх майстроў стралковай справы, майстроў спорту. Мы не сумняваемся, што часці Чырвонай арміі атрымаюць дастойных камандзіраў і на справе апраўдаюць высокае званне «калінінцаў».

Школа, на аснове агульнага росту палітычнай свядомасці і культурнасці прапоўных мас Совецкага Саюза, у тым ліку і БССР, мела магчымасць набраць новае папаўненне з фабрык, заводаў і калгасаў, з высокай агульнай развітасцю.

Гэта, а таксама і больш новыя складаныя задачы, падыходзячага года ставяць перад намі задачу не супакойвацца а напружана працаваць над падрыхтоўкай кожнага курсанта ў паасобку.

Ажыццяўляючы ўказанні любімага наркома К. Е. Варашылава, школа, пад кіраўніцтвам рэвалюцыйнага ваеннага совета БВА, выйшла ў лік перадавых. Пад яго кіраўніцтвам мы паспяхова змагаемся за бясспрэчнае першынства БВА і сярод ВНУ РСЧА.

Ваенком АБВШ імя М. І. Калініна ШАДУРО.

ПРЫВІТАННЕ МЕНГАРКОМА КП(б)Б

Менскі гарком КП(б)Б шле гарачае большэвіцкае прывітанне камандаванню, партарганізацыі, выкладчыцкаму калектыву і выпускнікам—камандзірам АБВШ.

Беларуская вайсковая школа паўніла рады нашай слаўнай Чырвонай арміі сотнямі баявых, адукаваных у ваенных і палітычных адносінах, класава-вытрыманых і адданых інтэрэсам пролетарыята камандзіраў.

Ваша школа па баявой і палітычнай падрыхтоўцы стала адной з перадавых і ўзорных школ у Саюзе. Гарком КП(б)Б выказвае ўпэўненасць, што выпускаемыя сёння новыя кадры камандзіраў перад тварам растучай пагрозы вайны супроць першай у свеце пролетарскай дзяржавы выкарыстаюць веды, атрыманыя ў школе, і захаваюць баявыя традыцыі АБВШ у будучых баях за совецкі Окцябр.

Няхай жывуць выпускнікі-камандзіры!

Няхай жыве непераможная Чырвоная армія і яе жалезны палкаводзец Клім Варашылаў!

Няхай жыве наша родная большэвіцкая партыя і яе ленінскі ЦК на чале з таварышам СТАЛІНЫМ!

Сакратар Менгаркома КП(б)Б РЫСКІН.

ЗНАТНЫЯ ЛЮДЗІ ЛЕСУ І СПЛАВУ У тав. ГІКАЛО

Учора група дэлегатаў усебеларускага злёта знатных людзей лесу, сплаву і падсочкі была прынята сакратаром ЦК КП(б)Б тав. Гікало. На сустрэчы прысутнічалі заг. промаддзела ЦК КП(б)Б тав. Готфрыд упоўнаркамлес т. Розін і інш.

Дэлегаты расказалі аб сваёй рабоце і поспехах, пасля чаго тав. Гікало адзначыў, што перад работнікамі лясной прамысловасці стаяць вялікія і адказныя задачы.

У нас многа лясоў. Ёсць лясы некультурныя, запушчаныя, але ёсць і добрыя, культурныя лясы. Мы часам не ўмеем захоўваць гэтыя лясы. Нават культурныя лясы запускаюцца і знаходзяцца без усякага догляду.

Не хапае культурных, гаспадарскіх адносін да лесу і захавання яго.

Нямалаважнае пытанне, якое паўстае перад работнікамі лесу, — гэта захоўваць яго, правільна арганізаваць работу ў лесе.

Асаблівую ўвагу тав. Гікало звярнуў на сплаў.—Сплаў—гэта таксама вытворчасць.—гаворыць тав. Гікало.—Яго трэба ўмела арганізаваць. Сплаўшчыкі могуць зрабіць вельмі многае, калі іх добра расставіць, калі правільна арганізаваць іх работу. Трэба арганізаваць снабжэнне сплаўшчыкаў. Гэта вялікая справа.

План лесасплаву мы выканалі. Гэта вялікае дасягнення. Але супакойвацца на гэтым нельга. Матэрыяльна-бытавым пытанням, культурнаму абслугоўванню трэба аддаць асаблівую ўвагу.

Далей тав. Гікало расказаў сплаўшчыкам аб тым, як зараз БССР выконвае гаспадарчыя кампаніі.

І калі мы дружна папрацуем, яшчэ лепш арганізуем работу на ўсіх участках, мы можам быць упэўнены, што БССР атрымае ордэн Леніна. Гэтыя словы тав. Гікало былі спатканы апладысментамі ўсіх прысутных.

Прафесар—удзельнік дэлегацыі тав. Перахода расказаў аб дасягненнях навуковай работы па лясной справе. Наш гомельскі лесатэхнічны інстытут рыхтуе лесатэхнікаў, навукова-даследчы інстытут правядзіць вялікую даследчую работу. Дрэнна толькі тое, што мала выдаюць навукова-тэхнічнай літаратуры, а яна зараз вельмі і вельмі патрэбна.

Лепшыя людзі сплаву—Сцяпан Туфар, Казей і Міцкевіч расказалі аб сваёй рабоце і метадах, якімі яны працуюць.

У заключэнне тав. Гікало пазнаёміў дэлегатаў з тым, як будзе праходзіць святкаванне Окцябрскай гадавіны і выказаў пажаданне, каб таварышы ўстанавілі паміж сабой сувязь, сістэматычна абменьваліся вопытам, а калі прыедуць дамоў, расказалі аб тым, што яны чулі на злёце, перадалі свой вопыт усім сплаўшчыкам.

ПАСТАНОВА БЮРО ЦК КП(б)Б АБ ІЛЬНОТРАПАЛЯКАХ ГАРЛАЧОВА

Паводле паведамленняў членаў Бюро ЦК, наглядаўшых на месцах факты дрэннай работы ільнотрапалак Гарлачова, і па заяве самога тав. Гарлачова, выехаўшага для пазеркі на месцы паступіўшых вестак аб дрэннай рабоце ільнотрапалак, — устаноўлена, што ільнотрапалкі, выпушчаныя Бабруйскім і Гомельскім дрэваапрацоўчымі камбінатамі (выробляючымі драўляныя часткі), заводамі Гомсельмаш і «Чырвоны металіст» і Аршанскай МТС (выробляючымі металічныя часткі), аказаліся выключна значынна выробленымі і зусім негодным і к рабоце, што сведчыць аб самых недапушчальных антыдзяржаўных адносінах з боку гэтых прадпрыемстваў да выканання важнейшага задання ЦК і адсутнасці якога-б там ні было кантролю за выробам гэтых ільнотрапалак з боку НКМесцпрома і ільнокіраўніцтва Наркамзема.

Прапанаваць Упоўнаркомлеса (Розіну) нам. Наркаммесцпрома (Свірыдаву) прадставіць грунтоўную запіску ў ЦК аб тым, як магло здарыцца, што выключна адказны заказ быў выканан такім злачынным чынам.

Даручыць пракурору рэспублікі, на аснове маючыхся фактаў, тэрмінова правесці расследаванне па пытанню ў цэлым аб ільнотрапалках Гарлачова і не пазней 20 лістапада заслухаць спецыяльна на Бюро ЦК паведамленне па гэтаму пытанню пракурора рэспублікі т. КУЗЬМІНА, упоўнаркомлеса т. РОЗІНА і нам. Наркаммесцпрома т. СВІРЫДАВА, дырэктара Белсельгаспаба т. ПЕТРАШКЕВІЧА.

Т. т. Молакаў і Бабушкін у Віцебску

ВІЦЕБСК, 4 лістапада. (Па тэлефону ад карэспандэнта «Звязды»).

Сёння раніцою ў Віцебск прыехалі герой Совецкага Саюза тав. Молакаў і лётчык-палярник тав. Бабушкін.

Тт. Молакава і Бабушкіна на вакзале сустракалі шматлікія рабочыя калоны і ваенныя часці.

Ад імя пролетарыята Віцебшчыны прыехаўшых гасцей вітаў стар шыня горпрофсовета тав. Есько.

Доўга незмаўкаючымі апладысментамі і крыкамі «ура» было спаткана выступленне тав. Молакава.

Сёння днём тт. Молакаў і Бабушкін наведаюць рад прадпрыемстваў, а вечарам выступяць на агульнагарадскім сходзе рабочых з дакладам аб паходзе «Чэлюскіна» і рабоце выратавальнай экспедыцыі.

АРК. ЗАРУБЕЖНЫ.

ПРАЦОЎНЫЯ АДНААСОБНІКІ СУСТРАКАЮЦЬ ОКЦЯБРСКУЮ ГАДАВІНУ І ПЕРАВЫБАРЫ СОВЕТАЎ МАСАВЫМ ПРЫЛІВАМ У КАЛГАСЫ

ШЫРЫЦЦА КАЛГАСНЫ ПРЫЛІЎ

ТУРАЎ.

Разгортванне падрыхтоўкі да перавыбараў Советаў працоўныя адна асобнікі Тураўшчыны адзначаюць новай хваляй калгаснага прыліву. Аднаасобнікі пасёлка Люболь у адказ на адозву ЦВК СССР і БССР аб перавыбарах сельскіх советаў арганізавалі новы калгас імя VII з'езда советаў. У калгас уступіла 18 гаспадарак.

Любольцы звярнуліся да ўсіх беднякоў і сераднякоў свайго сельсовета з заклікам паследаваць іх прыкладу. Заклік любольцаў знайшоў шырокі водгук сярод аднаасобнікаў. 65 лепшых бяднацка-серадняцкіх гаспадарак вёскі Танеж уступіла ў калгас «Труд». 40 аднаасобных гаспадарак вёскі Слабады ўступіла ў калгас «Чырвонае Палессе». Усе ўступіўшыя ў калгасы аднаасобнікі поўнасцю разлічыліся з дзяржавай па паставках і загатоўках.

Г. ГРУК.

ЕЛЬСК.

На адозву ЦВК СССР і БССР аб перавыбарах Советаў працоўныя аднаасобнікі Ельскага раёна адказваюць масавым уступленнем у калгасы. 26 аднаасобных гаспадарак вёскі Прачомышлі аб'ядналіся ў калгас імя XI усебеларускага з'езда Советаў. За апошнія тыдні па раёну ўступіла ў калгасы больш 1.500 аднаасобных гаспадарак.

Д. ТУЧЭНКА.

УЗДА.

У калгасы Уздзенскай МТС з 1 жніўня па 20 кастрычніка ўступіла 908 бяднацка-серадняцкіх гаспадарак. У калгасах МТС аб'яднана 86 проц. аднаасобных гаспадарак.

КЛІМАЎ.

ПУХАВІЧЫ.

Дукорскі сельсовет раней лічыўся адным з адстаючых па калектывізацыі. За апошні час у сувязі з разгортваннем масавай работы сярод аднаасобнікаў падаўся прыліў у калгасы.

Толькі за два дні ў калгасы сельсовета ўступіла 120 гаспадарак. Сельсовет набліжаецца да суцэльнай калектывізацыі.

ПІКУЛІК, ПІСАРЧЫК.

ЧАВУСЫ.

Зарасцянскі сельсовет, які з поспехам завяршыў сельска-гаспадарчы год, за апошні час засіўся вялікага аруху ў калектывізацыі вёскі. У калгасах сельсовета аб'яднана 97 проц. бяднацка-серадняцкіх гаспадарак.

П. ДЗЯРУЖЫН.

Справаздача члена сельсовета Пачкзева

(Ад віцебскага карэспандэнта «Звязды»).

Член Шумячскага сельсовета, аднаасобнік вёскі Перавоз Пачкаў Фёдар гэтымі днямі рабіў справаздачу перад сваімі аднавяскоўцамі аб сваёй рабоце ў сельсовеце. У сваёй справаздачы тав. Пачкаў адзначыў, што за час работы ў сельсовеце ён пераканаўся ў перавазе калгаснай гаспадаркі над аднаасобнай і зараз рашуча ўступіць ў калгас.

Выступленне тав. Пачкаева, які карыстаецца аўтарытэтам у вёсцы, зрабіла вялікі ўплыў на аднаасобнікаў вёскі Перавоз. 15 аднаасобнікаў на чале з Пачкаевым арганізавалі новы калгас і назвалі яго імем таварыша Сталіна.

Арк. ЗАРУБЕЖНЫ.

1116 НОВЫХ КАЛГАСНІКАЎ

МОЗЫР. (Ад карэспандэнта «Звязды»).

У рэзультаце справаздачна-перавыбарчай кампаніі советаў у раёне ўзмацніўся прыліў працоўных аднаасобнікаў у калгасы. За кастрычнік уступіла 1.116 гаспадарак.

На 1 лістапада ў раёне аб'яднана калгасамі 65,2 проц. сялянскіх гаспадарак.

ФРАЛОЎ.

КАЛГАСЫ ТАЛАЧЫНСКАЙ МТС ВЫКАНАЛІ ПЛАН ІЛЬНОЗАГАТОВАК

ЦК КП(б)Б—ТАВ ГІКАЛО, ПАЛІТСЕКТАР НАРКАМЗЕМА ТАВ. — РАТНЕКУ, НАРКАМЗЕМ — ТАВ. БЕНЕКУ, «ЗВЯЗДЗЕ».

План ільнозагатовак у 2.227 цэнтнераў на 1 лістапада калгасамі Галачынскай МТС выканан поўнасцю. На склады Заготзна здана 2.239 цэнтнераў ільнозалажна. Валакно здана нумарам 9,1 пры плане 9, траста нумарам 1,6 пры плане 1,38. Прадаўжаем барацьбу за выкананне плана кожным калгасам у паасобку.

Дырэктар Талачынскай МТС БОЕЎ.
Нач. палітадзела ЛЮШЫЦ.

ПРЫЛІЎ У КАЛГАСЫ ВІЦЕБШЧЫНЫ

ВІЦЕБСК. (Па тэлефону ад карэспандэнта «Звязды»).

У рэзультаце праведзенай масавай работы па лепшай сустрэчы Окцябрскіх свят значна ўзмацніўся прыліў у калгасы. У калгасы Міхайлеўскага сельсовета—імя Варашылава, «Шлях социялізма» і інш. —уступіла 45 аднаасобных гаспадарак. У калгасы Нікалаеўскага сельсовета «Серп і молат», «Сілач» і інш.—30 гаспадарак. У калгасы Рудніцкага сельсовета—імя Ланчуцкага, «Прагрэс»—25 гаспадарак. Усяго па раёну за апошні час уступіла звыш 100 гаспадарак.

У калгасе імя Калініна, Сялюцкага сельсовета, набудаваны новы прасторны і светлы кароўнік на 45 галоў жывёлы і добра абсталявана асаблівіхімаўская канюшня.

У калгасе імя Чарлякова, Віцебскага сельсовета, будуе лепшаму калгаснику-ўдарніку тав. Кожмыніцаву новую хату за яго добрую работу на жывёлагадоўлі.

У калгасе «Гроза», Вялікі-Лётчанскага сельсовета, расшыраецца клуб і адкрываецца хата-абмуладорня.

Калгасы Капачова і «Барацьбіт» да свят электрыфікуюцца. Электрасвятло праведзена ў кватэры калгаснікаў, у канюшні і кароўніці.

ЗАРУБЕЖНЫ.

ЯК ВЫКАНАНЫ НАКАЗЫ

На аснове рашэнняў з'ездаў ВКП(б) і КП(б)Б X з'езд советаў Беларускай ССР, які адбываўся ў лютым 1931 г. прыняў разгорнутае рашэнне, накіраванае на далейшае развіццё социялістычнага будаўніцтва ў горадзе і ў вёсцы ў БССР і няўхільны рашучы ўздым матэрыяльнага добрабыту шырокіх працоўных мас. Ажыццяўляючы гэтыя рашэнні, працоўныя БССР дасягнулі велізарных поспехаў.

ІНДУСТРЫЯЛІЗАЦЫЯ БССР

«X усебеларускі з'езд советаў даручае ўраду Беларускай ССР і ў далейшым неаслабна праводзіць індустрыялізацыю Беларускай ССР, усё больш павялічваючы вядучую ролю прамысловасці, базуючыся, галоўным чынам, на мясцовай сыравіне, а таксама на прывозным сыравіне і поўфабрыкатах».

ШТО ЗРОБЛЕНА

За гады, якія адзяляюць нас ад X з'езда Советаў, Беларуская ССР, пад кіраўніцтвам нашай партыі няўхільна праводзіла лінію на індустрыялізацыю нашай краіны. За гэты час пабудаваны і асвоены заводы - гіганты, абсталяваныя паводле апошняга слова тэхнікі, заводы, якія маюць не толькі беларускае, але і ўсесаюзнае значэнне.

Вось гэтыя заводы: ГОМЕЛЬСКІ ШКЛОЗАВОД, МАГІЛЕЎСКАЯ ФАБРЫКА ШТУЧНАГА ШОЎКУ, ГОМСЕЛЬМАШ, БЫХАЎСКІ АЦЭТОНАВЫ ЗАВОД, БАБРУЙСКІ, ГОМЕЛЬСКІ, ВІЦЕБСКІ ЛЕСАКАМБІНАТЫ, МАГІЛЕЎСКІ СКУРАЗАВОД, ФАБРЫКІ «СЦЯГ ІНДУСТРЫЯЛІЗАЦЫІ» І ІМЯ ДЗЕРЖЫНСКАГА, ПАНЧОШНА-ТРЫКАТАЖНАЯ ФАБРЫКА «КІМ», КРЫЧАЎСКІ ЦЭМЕНТНЫ ЗАВОД, ЗАВОД ЛАНШУГОЎ ГАЛЛЯ. Вось далёка не поўны пералік новабудоў.

У адпаведнасці з дырэктывамі X з'езда карэнным чынам рэканструяваны старыя прадпрыемствы, прычым праведзена такая рэканструкцыя, што ад старых заводаў амаль нічога не асталося.

Калі ў 1913 годзе ўдзельная вага валавой прадукцыі ўсёй прамысловасці тагочаснай Беларусі ў прамысловасці старой Расіі складала 0,87 проц., дык у 1928 годзе яна ўзняслася да 1,12, а ў 1932 ужо складае 2,5 проц.

У выніку разгорнутага велізарнага прамысловага будаўніцтва ўзнялася роля і ўдзельная вага прадукцыі, выпускаемай беларускімі прадпрыемствамі. Так, напрыклад, швейныя прадпрыемствы БССР выпускаюць 8 проц. усёй швейнай прадукцыі Совецкага Саюза, трыкатажная прамысловасць 7 проц., шкляная 10 проц., запалкавая 25 проц., папяровая 9,5 проц., абутковая 5 проц. Па харчовай прамысловасці: вытворчасць малочнай кіслаты складае 60 проц. усёй вытворчасці СССР, дражджавая вытворчасць 26,6 проц., спіртагарэлачная — 7,7 проц., маргарынавая 5,9 проц.

Удзельная вага валавой прадукцыі прамысловасці БССР дасягнула зараз 60 проц. у прадукцыі ўсёй народнай гаспадаркі замест 35 проц. у 1930 г.

Такім чынам, з гэтых, далёка няпоўных, даных можна з упэўненасцю зрабіць вывад: АЖЫЦЦЯЎЛЯЮЧЫ РАШЭННІ З'ЕЗДА, БССР ПЕРАТВАРЫЛАСЯ Ў ІНДУСТРЫЯЛЬНА-АГРАРНУЮ КРАІНУ З ДАВОЛІ РАЗВІТАЙ ПРАМЫСЛОВАСЦЮ.

Іменна прамысловасць з'яўляецца зараз вядучай ва ўсёй народнай гаспадарцы.

Нельга не адзначыць, што рад новавабудаваных прадпрыемстваў яшчэ слаба асвойваюцца. У выніку гэтага на многіх з іх не выконваюцца вытворчыя праграмы.

На барацьбу за поўнае асваенне прадпрыемстваў, за аўладанне тэхнікай, за рэалізацыю 6 гістарычных указанняў тав. Сталіна павінны быць мабілізаваны ўсе сілы.

ВЫПРАЦОЎКА ТОРФУ І ЭЛЕКТРАЭНЕРГІІ

«Цэнтральная ўвага ў прамысловым будаўніцтве павінна быць звернута на развіццё энергетычнай і апалавай базы. Таму разгортванне электрабудаўніцтва і торфяной прамысловасці з мэтай павел чэння сплававай базы і пераапрацоўкі торфу, як сыравіны, павінна з'явіцца асноўнай задачай усіх совецкіх і гаспадарчых арганізацый.

ШТО ЗРОБЛЕНА

а) ВЫПРАЦОЎКА ЭЛЕКТРАЭНЕРГІІ

Да рэволюцыі толькі ў больш буйных губернскіх гарадах былі маламоцныя электрастанцыі, якія не мелі ніякага прамысловага значэння. Асноўным іх значэннем было асвятляць цэнтральныя буржуазна-купецкія і чыноўніцкія кварталы тагочасных гарадоў.

У былой калоніі царскага самаўладства, Беларусі, раскінулася цяпер шырока разгалінаваная сетка магутных электрастанцый. КАЛІ МАГУТНАСЦЬ УСІХ ЭЛЕКТРАСТАНЦЫЙ У 1927-28 ГОДЗЕ СКЛАДАЛА ТОЛЬКІ 14.400 КІЛОВАТ, ДЫК У 1933 ЯНА СКЛАДАЕ ЎЖО 70 000 КІЛОВАТ, ВЫПРАЦОЎКА ЭЛЕКТРАЭНЕРГІІ Ў 1928 СКЛАДАЛА 35 МЛН. КІЛОВАТ-ГАДЗІН, У 1933 ГОДЗЕ ЯНА ДАСЯГНУЛА ЎЖО 220 МЛН. КІЛОВАТ - ГАДЗІН.

За гэты перыяд пабудован рад новых электрастанцый, павялічана магутнасць існуючых. Пушчана Белдрэс імя Сталіна на 24.000 кілават, Добрушская ЦЭЦ на 3.500 клв., Крычаўская ЦЭЦ — на 2500, Менская ЦЭЦ на 6.000 кіловат, Гомельская электрастанцыя на 3.000, Бабруйская на 3.000, ЦЭЦ лесакамбіната імя Гікало на 1.000 клв., Магілёўская на [illegible] і Барысаўская — на 2.000 кіловат.

ТАРФЯНАЯ ПРАМЫСЛОВАСЦЬ

«Грунтам у развіцці прамысловасці павінна стаць найшырэйшае скарыстанне мясцовай багатай тарфяной апалавай базы і больш хуткае разгортванне электрыфікацыі на тарфяным апале».

ШТО ЗРОБЛЕНА

Торф ва ўмовах БССР з'яўляецца асноўным апалам для энергагаспадаркі. Запасы торфу ў БССР вылічваюцца ў 642.000 гектараў.

У 1931 годзе было здабыта па БССР 505 тыс. тон торфу, а ў 1934 годзе ўжо 1.367 тыс. тон.

Тарфяная прамысловасць БССР дабілася ў 1934 годзе вялікіх дасягненняў.

Павялічылася ў параўнанні з мінулымі гадамі ўдзельная вага механізаваных спосабаў здабычы торфу. У 1931 г. яна складала 6,5 проц. На 1935 год вызначана 45,2 проц.

Адвакасобнік тав. СТРЫЛОЎСКІ, былы чырвоны партызан, падае заяву аб уступленні ў калгас імя Варатынскага (Менскі раён).

УДЗЕЛЬНАЯ ВАГА ТОРФУ Ў АПАЛАВЫМ БАЛАНСЕ ПРОМТЭХГРУПЫ

1930 г.	1931 г.	1932 г.	1933 г.	1934 г.
Расход торфу у тыс. тон				
125	360	470	571,6	806
У процентах				
14,1	23,8	20,3	27,1	23,7

Дзесяткі электрастанцый і прадпрыемстваў БССР працуюць зараз на тарфяным апале. З найбольш буйных можна назваць БелДРЭС, Магілёўскую ЦЭЦ, Крычаўскі цэментны завод, Гомельскі шклозавод. Паступова пераходзяць і ў значнай ступені перайшлі ўжо да ўжывання торфу Гомельская і Менская электрастанцыі і Барысаўская ЦЭЦ імя Леніна.

ХАРЧОВАЯ ПРАМЫСЛОВАСЦЬ

«Пашырыць прамысловасць, якая задавальняе спажывецкія патрэбы шырокіх працоўных мас».

ШТО ЗРОБЛЕНА

У 1928 г. харчовая прамысловасць складала 11,4 проц. валавой прадукцыі чатырох наркаматаў БССР, у 1932 г. — 16,1, у 1933 г. — 20,2 проц. і ў 1934 г. — 20,4 проц. Гэтыя лічбы ярка сведчаць аб росце харчовай прамысловасці БССР. У 1930 г. ПАБУДАВАНЫ АРШАНСКІ МЯСАКАМБІНАТ, ВІЦЕБСКІ МАСЛАСЫРЗАВОД, ГОМЕЛЬСКІ ХАЛАДЗІЛЬНІК, БАБРУЙСКАЯ МАРМЕЛАДНАЯ ФАБРЫКА, КРУХМАЛЬНЫ ЗАВОД У ЧЫРВОЧЫМ БЕРАЗЕ, ПОЛАЦКІ ПТУШКАКАМБІНАТ на агульную суму 6.070 тыс. руб. У 1931 г. пабудаваны кандзітэрскія фабрыкі «Комунарка» ў Менску і «СПАРТАК» ў ГОМЕЛІ, МАКАРОННАЯ ФАБРЫКА Ў БАРЫСАВЕ, ЖЛОБІНСКІ ПТУШКАКАМБІНАТ, ДВА КРУХМАЛЬНЫЯ ЗАВОДЫ І МЕНСКАЯ КАЎБАСНАЯ ФАБРЫКА. Закончана будаўніцтва двух прудавых рыбных гаспадарак.

У 1932 г. пушчаны ў строй Гомельскі маргарынавы завод, завод малочных кіслот у Менску, гародне-сушыльны завод у Магілёве, крухмальныя заводы ў Веткаўскім і Горацкім раёнах, тры пладзівенныя заводы і т. д. Рэканструяваны ўсе існуючыя харчовыя прадпрыемствы.

У 1933 г. уведзены ў эксплуатацыю два крухмальныя заводы і Гомельскі патачны завод. Пачата будаўніцтва на тэрыторыі Гомельскага маргарынавага завода буйнейшага ў Саюзе гідрагенізацыйнага завода з вытворчай магутнасцю у 20 тыс. тон саломы (асноўны прадукт для атрымання маргарына) і мыла-варанага завода, які будзе выпускаць ужо ў 1935 г. 20 тыс. тон гаспадарчага мыла. У Магілёве будуецца косцеапрацоўчы камбінат, у Віцебску халадзільнік, у Камарыне — крухмальны завод.

РОСТ ВАЛАВОЙ ПРАДУКЦЫІ ХАРЧОВАЙ ПРАМЫСЛОВАСЦІ

(У тысячах руб. па цэнах 1926-27 г.)

Гады	Сума валавой прадук.	Рост у адн. да 1927-28 г.
1927-28	23 900	100 проц.
1931	106 959	449 проц.
1932	116.126	488 проц.
1933	135 900	571 проц.
1934	160.237	673 проц.

2. РАБОЧЫ КЛАС

«Ліквідацыя ў асноўным беспрацоўя ў БССР, высокія тэмпы штогодняга ўцягнення рабочай сілы ў вытворчасць, ніякая забяспечанасць прамысловасці тэхнічнай кваліфікаванай сілай патрабуюць далейшага ўзмацнення ўвагі да існуючай сеткі школ у кірунку задавалення іх патрэбным абсталяваннем, патрэбнай плошчай, навуковымі кадрамі, павышэннем якасці рыхтуемых спецыялістаў».

Наяўны дэфіцыт у кваліфікаваных тэхнічных кадрах патрабуе далейшага шпаркага разгортвання вышэйшай і сярэдняй асветы, асабліва ў адносінах падрыхтоўкі спецыялістаў па торфапрамысловасці.

ШТО ЗРОБЛЕНА

З года ў год, з месяца ў месяц расце рабочы клас БССР.

Калі ў 1913 г. колькасць рабочых, занятых на саматужных і поўсаматужных прадпрыемствах складала каля 20 тыс. чалавек, дык у 1934 г. колькасць занятых у прамысловасці БССР рабочых складае 108.020 чал. Апрача таго занята на будаўніцтве звыш 60 тысяч чал. і ў сельскай гаспадарцы каля 120 тысяч рабочых.

РОСТ КОЛЬКАСЦІ РАБОЧЫХ У ПРАМЫСЛОВАСЦІ

1928 г.	1934 г.
33,713	108.020

Рабочы клас БССР, як і ўсяго Совецкага Саюза, не ведае, што такое беспрацоўе, ён упэўнен у сваім заўтрашнім дні. Ён не ведае эксплуатацыі, ён сам гаспадар свайго прадпрыемства.

ТЭХНІЧНЫЯ КАДРЫ

Адна з шасці ўмоў тав. Сталіна аб стварэнні сваёй вытворча-тэхнічнай інтэлігенцыі знайшла шырокае развіццё ў Совецкай Беларусі. Пачынаючы з 1930 г. няўхільна павышаецца насычанасць нашай прамысловасці спецыялістамі. Калі ў 1932 г. у прамысловасці было 5.047 інжынераў і тэхнікаў, дык у 1934 г. іх колькасць узрасла да 6.888.

На тысячу рабочых у 1932 г. прыходзілася 41,9 інжынераў і тэхнікаў, у 1934 г. іх прыходзіцца 62 чал.

Рабочы клас стварае сваю ўласную вытворча-тэхнічную інтэлігенцыю. За апошнія гады нашы вышэйшыя і сярэднія тэхнічныя навучальныя ўстановы падрыхтавалі дзесяткі тысяч спецыялістаў. У 1931 г. выпушчана 4.425 спецыялістаў, у 1932 г. — 7.779, у 1933 г. — 9.790 і ў 1934 г. — 9.794.

Створан навукова-даследчы інстытут прамысловасці, які праводзіць вялікую навуковую работу. Выпушчаныя дзесяткі вучоных спецыялістаў па розных галінах вытворчасці.

ЖАНОЧАЯ ПРАЦА

«Адным з моцных рэзерваў уцягнення рабочай сілы павінна з'яўляцца работа над сістэматычным прытокам і ўкараненнем у прамысловасць жаночай працы (жонак рабочых, членаў сем'яў рабочых, свабодная жаночая працоўная сілы ў калгасах»).

ШТО ЗРОБЛЕНА

Гэта пастанова з'езда знайшла поўнае адлюстраванне ва ўсёй рабоце. З года ў год няўхільна павышаецца ўцягненне жанчын у прамысловасць. Відаць гэта з наступных лічбаў.

1931 г.	1932 г.	1933 г.	1934 г.
29.987	46.664	48.824	55 184

Калі ў 1931 г. колькасць жанчын, занятых у прамысловасці складала 31 проц. агульнага ліку рабочых, дык у 1932 г.—38,7 проц., у 1933 г. — 38,9 проц., у 1934 г. — 41 проц.

Прычым, асабліва трэба падкрэсліць, што жаночая праца пераважна прымяняецца на кваліфікаваных работах. Зараз значная колькасць жанчын знаходзіцца на камандных вышынях прамысловасці, пачынаючы ад брыгадзіра і канчаючы дырэктарам фабрык.

КОМУНАЛЬНАЕ БУДАЎНІЦТВА

«Надаючы асабліва важнае значэнне развіццю комунальнай гаспадаркі і жыллёвага будаўніцтва, з'езд советаў даручае ўраду забяспечыць поўнае выкананне прынятых планаў па галіне паляпшэнню добрабыту гарадоў, рабочых пасёлкаў і развіццю жыллёвага будаўніцтва».

ШТО ЗРОБЛЕНА

За першую пяцігодку па комунальна-жыллёваму будаўніцтву па БССР было выдаткавана 120 млн. руб., з якіх на жыллёвае будаўніцтва каля 72 млн. руб. (без прыватнага сектара), на комунальную гаспадарку і добрабыт 48 млн. руб.

За гэты час пабудавана 542 тыс. кв. метраў новай жылой плошчы, у Менску пабудован трамвай, у розных гарадах БССР праведзена каналізацыя, пабудаваны 3 новыя водаправоды, 33 лазні, 3 механізаваныя прачкарні і т. д. На брукаванне вуліц гарадоў затрачана ў першай пяцігодцы 10.200 тыс. рублёў.

Капіталаўкладанні толькі ў комунальную гаспадарку і добрабыт у 1933-34 г. складаюць ў 33 млн. руб — палову таго, што было выдаткавана на працягу першай пяцігодкі. Капіталаўкладанні ў 1934 г. перавышаюць на 5 млн. руб. укладанні ў мінулым годзе.

СЕЛЬСКАЯ ГАСПАДАРКА

«Адзначаючы вялікія дасягненні ў социялістычнай рэканструкцыі сельскай гаспадаркі, X усебеларускі з'езд советаў даручае ўраду і ў далейшым разгорнутымі максімальнымі тэмпамі ажыццяўляць залачы суцэльнай калектывізацыі сельскай гаспадаркі».

ШТО ЗРОБЛЕНА

Шлях, указаны нашай партыяй і яе вялікім правадыром тав. СТАЛІНЫМ — шлях калгаснага жыцця. На гэты шлях стала сялянства Совецкай Беларусі. З года ў год растуць калгасы. З года ў год ажыццяўляецца лозунг правадыра «зрабіць усе калгасы большэвіцкімі, а калгаснікаў заможнымі».

Значна ўмацаваліся совецкія гаспадаркі БССР. Зараз налічваецца 311 соўгасаў, з пасеўнай плошчай у 248 тыс. гектараў. У 1931 г. пасеўная плошча соўгасаў складала 107 тыс. гектараў.

Вось некаторыя даныя, якія паказваюць няўхільны рост калектывізацыі ў БССР.

На 1 СТУДЗЕНЯ 1932 г. было 4112 калгасаў, якія аб'ядналі 116 670 гаспадарак, АБО 15 ПРОЦ. УСЁЙ колькасці гаспадарак.

На 1 студзеня 1934 г. было 9.747 калгасаў, аб'яднана ў іх 406.138 гаспадарак, або 51,2 проц.

На 1 КАСТРЫЧНІКА 1934 г. налічваецца 10.248 калгасаў, у іх аб'яднана 477.046 гаспадарак, АБО 61,2 ПРОЦ.

Зараз у сувязі з паспяховым завяршэннем сельска-гаспадарчага года ўзнялася новая хваля калгаснага будаўніцтва. Рад раёнаў БССР сталі раёнамі суцэльнай калектывізацыі.

ЖЫВЁЛАГАДОЎЛЯ

«Пры ажыццяўленні социялістычнай перабудовы сельскай гаспадаркі ўсім совецкім і гаспадарчым арганізацыям, асабліва раённым выканаўчым камітэтам, трэба звярнуць максімальную ўвагу на вырашэнне праблемы жывёлагадоўлі і звязанай з ёю кармовай базы, а таксама на развіццё тэхнічных культур (лён, каналлі) у сельскай гаспадарцы. Таму трэба ажыццяўляць поўную ўвязку калектывізацыі сельскай гаспадаркі з дзе спецыялізацыяй».

ШТО ЗРОБЛЕНА

У адпаведнасці з дырэктывамі з'езда Совецкі ішло развіццё социялістычнай жывёлагадоўлі. Праўда, трэба з усёй рашучасцю падкрэсліць, што тут мы маем рад буйнейшых недахопаў. Ацэнка, якую даў на XVII з'езде партыі тав. Сталін цалкам адносіцца і да становішча жывёлагадоўлі ў БССР.

Вось чаму трэба з асаблівай сілай выконваць зараз, больш чым калі-б там ні было, дырэктывы партыі аб хутчэйшым і магутным развіцці жывёлагадоўлі.

Становішча жывёлагадоўлі ў БССР характарызуецца наступнымі данымі: на 1 лютага 1932 г. было 1243 МТФ (калгасны сектар), у іх 151.200 галоў жывёлы, з іх 80.100 малочных кароў.

На 1 кастрычніка 1934 г. ужо налічваецца 6438 МТФ, у іх 453.645 галоў жывёлы, у тым ліку 159.818 малочных кароў.

Свінагадоўчых ферм на 1 студзеня 1932 г. налічвалася 1.750 (калгасных), у іх 88.600 галоў, прычым свінаматак 39.700. А на 1 кастрычніка 1934 г. колькасць СКТФ узрасла да 3.665, у іх знаходзіцца 224.822 галавы свіней, прычым 45.808 свінаматак.

Значна развілася калгасная аўцагадоўля. Калі на 1 студзеня 1932 г. у калгасах было 2.200 авечак і ніводнай таварнай фермы, дык на 1 кастрычніка 1934 г. ужо налічваецца 2.601 аўцагадоўчая ферма з 99.833 авечкамі.

Па соўгасах БССР у 1932 г. было 59.500 галоў буйнай рагатай жывёлы і 78.000 свіней. У 1934 г. колькасць буйнай рагатай жывёлы павялічылася да 75.600, а колькасць свіней да 161.800.

Значна палепшылася становішча кармовай базы, аднак яго нельга лічыць яшчэ здавальняючым.

БССР УПЕРШЫНЮ Ў ГЭТЫМ ГОДЗЕ ПЕРАВЫКАНАЛА ПЛАН СІЛАСАВАННЯ. ЗАСІЛАСАВАНА 617.000 ТОН.

Перавагі буйнай калектыўнай жывёлагадоўлі, не гледзячы на рад недахопаў у рабоце ферм, павялічылі рост прадукцыйнасці жывёлы, асабліва рагатай. На многіх фермах удойнасць кароў узнялася на 50-60 проц. у параўнанні з тымі ўдоямі, якія гэтыя каровы давалі раней, у індывідуальнай сялянскай гаспадарцы.

З года ў год расце ўдзельная вага калгасных ферм у забеспячэнні рабочых і працоўных краіны малочнай і мясной прадукцыяй. Калгасныя фермы і соўгасы ператварыліся ў асноўных вытворцаў і пастаўшчыкоў таварнай прадукцыі дзяржаве.

Сіла калгаснай фермы адчуваецца яшчэ ў тым, што яна забяспечвае рост даходнасці калгасаў і калгаснікаў і аказвае значную дапамогу калгаснікам у набыцці жывёлы. Досыць адзначыць, што ў гэтым годзе фермы раздалі калгаснікам 11.300 цёлак і 11.600 парасят. Сотні ферм ужо даюць штогод дзесяткі тысяч рублёў даходу.

С. ПОССЭ

ЗА БОЛЬШЭВІЦКУЮ ГІСТОРЫЮ КП(б)Б

(Аб задачах гісторыкаў КП(б)Б)*

Адна з асноўных палітычных задач пры ажыццяўленні другой пяцігодкі заключаецца «ў перамаганні перажыткаў капіталізма ў эканоміцы і свядомасці людзей».

Тав. Сталін указваў на XVII партз'ездзе, што перажыткі капіталізма ў свядомасці людзей СССР з'яўляюцца спрыяючым, харчучым асяродзем для ажыўлення астаткаў ідэалогіі ворожых класаў і разбітых антыленінскіх груп у галовах асобных членаў партыі.

Тав. Сталін даказаў таксама, што гэта ажыўленне астаткаў ідэалогіі разбітых антыленінскіх груп аблягчаецца параўнальна нізкім тэарэтычным узроўнем большасці членаў нашай партыі, слабасцю ідэалагічнай работы партыйных органаў, загружанасцю нашых партыйных работнікаў чыста практычнай работай, адбіваючы ў іх магчымасць папоўніць свой тэарэтычны багаж.

Адсюль зусім відавочна, што цяпер, калі мы ўступаем ужо ў трэці год пяцігодкі пабудовы бяскласавага социялістычнага грамадства, неабходна ўсямернае ўзмацненне ідэйнай узброенасці членаў партыі, гэтай сур'ёзнай прадпасылкі поспехаў у барацьбе за перамаганне перажыткаў капіталізма ў эканоміцы і, тым больш, у свядомасці людзей. І калі паставіць пытанне аб сродках ідэйнага выхавання членаў партыі, то мы павінны будзем сказаць, што такой магутнейшай ідэйнай зброяй выхавання членаў партыі і нашай моладзі з'яўляецца ўзнятая на належную вышыню гісторыя нашай большэвіцкай партыі.

Ад гісторыкаў партыі адпаведным новым задачам, якія стаяць перад кожным комуністам у галіне социялістычнага будаўніцтва, патрабуецца карэнная перабудова ва ўсёй сістэме як навукова-даследчай, так і педагагічнай вучэбнай работы.

Голыя сацыялагічныя абагульненні, выведзеныя часта пры дапамозе механістычнага жанглавання марксісцкай тэрміналогіяй, павінны быць беспаваротна ліквідаваны і ў навукова-даследчай і ў педагагічнай рабоце нашых гісторыкаў. Яны (гэтыя голыя абагульненні) павінны ўступіць сваё месца сапраўды навуковым правільным абагульненням, абгрунтаваным на выкарыстанні і апрацоўцы вялікага сыроага матэрыялу, масы гістарычных фактаў. Аграмадную ролю тут павінны адыграць нашы партыйныя архівы. Нельга лічыць дапушчальным такое становішча, пры якім рад каштоўнейшых матэрыялаў ляжыць у нашых архівах мёртвым капіталам. Трэба, не чакаючы канчатковай апрацоўкі гэтых матэрыялаў для напісання вялікай гісторыі КП(б)Б ужо цяпер прыступіць да іх сістэматычнай апрацоўкі і неадкладнага апублікавання. Без ведання гістарычных фактаў, без ведання гістарычных падзей без вывучэння войн, асобных пачэстнай без знаёмства з біяграфічнымі данымі тах большэвіцкіх гісторыкаў. З пэўным правам мы можам сказаць, што выкладанне гісторыі партыі ў нашых ВНУ і школах пастаўлена цяпер на большэвіцкія рэйкі. І тым не менш мы павінны ўсё-ж канстатаваць, што ў нас яшчэ няма сапраўды навуковай гісторыі КП(б)Б.

Задача — узняць вывучэнне гісторыі нашай партыі на сапраўды навуковую вышыню — тое, аб чым пісаў таварыш Сталін у сваім гістарычным пісьме — не вытрымлівае, аднак, выкрыццём трацкісцкіх і ўсякіх іншых кантрабандыстаў. Гэта задача мае па мэце таксама дакладнае вывучэнне гісторыі асобных партыйных арганізацый, дэтальнае азнаямленне са складам партыйных з'ездаў, ведание хроналагічных дат, знаёмства з палітычнай і эканамічнай абстаноўкай, у якой вяла барацьбу, расла і мацнела большэвіцкая партыя.

На жаль, прыходзіцца прызнаць, што і на сёння некаторыя выкладчыкі нашых школ і ВНУ не зразумелі да канца значэння гістарычнага пісьма таварыша Сталіна. Выкладанне гісторыі партыі сямтам і сёння вядзецца па-старыму, упор робіцца на толую сацыялогію, факты партыйнай гісторыі не асвятляюцца, адсутнічае канкрэтны ілюстрацыйны матэрыял.

Да чаго вядзе такая бездапаможнасць, каб не сказаць больш рэзка? Гэта вядзе да сумнага, шаблоннага ўкаранення ў галовы вучняў мёртвых, адарваных ад жывых людзей і гістарычных падзей схем і формул. Атрымліваецца не гісторыя партыі, якая заклікана служыць магутным кіраўніцтвам да рэволюцыйнага дзеяння, а сухі палітмінімум, нешта накшталт «прымусовага асартымента» да асноўных навук.

А між тым гісторыя партыі пры правільнай пастаноўцы выкладання з'яўляецца захапляючай і цікавейшай навукай, але для гэтага ў выкладанні гісторыі партыі трэба абмяжоўвацца не толькі пастаноўкай агульных праблем, не толькі выкладаннем філасофіі пытання, а трэба паказаць дзейнасць герояў той вялікай гістарычнай барацьбы, якую вялі гэтыя «лепшыя людзі на чале з Леніным на працягу дзесяткаў год супроць народнікаў, эканамістаў, легальных марксістаў, меншавікоў, трацкістаў, правых, «ляванцкіх» і прымірэнчых элементаў у партыі» (Кагановіч), рысаваць барацьбу жывых людзей, робячых гэту гісторыю, адлюстроўваць самы ход барацьбы і пазіцый, асвятляючы ўсё гэта тэорыяй матэрыялістычнай дыялектыкі. Толькі пры гэтых умовах і філасофія большэвіцкай гісторыі партыі будзе не завучвацца а [illegible] як зразумелая і блізкая справа для кожнага вучня і, [illegible] толькі тады выкладанне большэвіцкай гісторыі партыі стане на сапраўды навуковыя рэйкі.

На практычнай выкладчыцкай рабоце нашы гісторыкі партыі часта забываюць, што ленінскі этап у развіцці гістарычнай навукі патрабуе ад кожнага гісторыка наогул, ад гісторыка партыі тым больш, уменне «ўлавіць канкрэтную гістарычную сітуацыю, прасачыць усё развіццё і ўвесь пасляўны ход рэволюцыі, вывесці нашы задачы не з прынцыпаў праграмы толькі, а з папярэдніх крокаў і этапаў руху».

Мы павінны з усёй сілай падкрэсліць, што канкрэтны аналіз канкрэтнай гістарычнай абстаноўкі, абавязковы для дыялектычнага матэрыялізма, магчым толькі на аснове паслядоўнага вывучэння ўсіх этапаў гістарычнага развіцця, толькі на аснове багатага ведання гістарычных фактаў.

Канкрэтна гістарычны аналіз у вывучэнні гісторыка-партыйнага мінулага, асабліва абавязковы таму, што гэта мінулае служыць для нас магутнейшым сродкам выхавання новых кадраў, непасрэдных удзельнікаў будаўніцтва социялізма ў цяперашнім і будучым.

Трэба навучыць гэтыя кадры канкрэтна разбірацца ў канкрэтнай гістарычнай абстаноўцы мінулага, навучыць іх таго, каб узброеныя канкрэтным веданнем гістарычных фактаў, асветленых марксізмам-ленінізмам, гэтыя кадры маглі-б ўжо не толькі канкрэтна вывучаць, а правільна на аснове прынцыпаў Маркса-Энгельса-Леніна-Сталіна канкрэтна «рабіць» гісторыю.

Само сабой зразумела, што партыйны гісторык не можа абмежавацца толькі апісаннем і рэгістрацыяй асобных гістарычных фактаў. Ён павінен усямерна асцерагацца якога-б там ні было ўхілення ў бок буржуазнага прагматызма, калі гісторык тоне ў масе гістарычных фактаў, не ўмеючы іх па-навуковаму абагуліць.

Мы вывучаем гісторыю партыі не з простай цікавасці, не ў якасці архіварусаў-аматараў старыны, нам патрэбна гісторыя партыі, як магутны фактар выхавання нашай моладзі, як сродак для выхавання новых кадраў у духу большэвізма. Нам патрэбна гісторыя партыі не ў якасці архіва, а як кіраўніцтва да рэволюцыйнага дзеяння.

Наша партыйная «гісторыя не ёсць, як гэта думаюць многія гісторыкі-схематыкі, гісторыя беззваротна прашоўшага мінулага, ка нучэшага ў нябыт ўчарайшага дня. Уся гісторыя наша ёсць праграма, стратэгія і тактыка, арганізацыя гераічнай барацьбы лепшых, перадавых элементаў нашага класа за перамогу дыктатуры пролетарыята, за знішчэнне класаў, за комунізм» (Кагановіч).

«Не можа быць свядомым рабочым той, хто адносіцца як Іван Непомнячы да гісторыі свайго руху».

«Бяспамяцтва адносна ўчарайшага дня роўна апартунізму».

Вось як ацэньваў значэнне гісторыі партыі Ленін.

Такім гістарычныя факты нам патрэбны не як самамэта, яны патрэбны нам, як сродак для вялікіх палітычных, навукова-праверэраных абагульненняў. Прычым гэтыя абагульненні павінны апірацца не на асобныя, штучна падабраныя, падагнаныя да схемы факты, а на ўсебаковым глыбокім даследванні вялікага гістарычнага матэрыяла, па дакладным вывучэнні і праверцы многіх гістарычных фактаў.

Сацыялагічныя абагульненні, матываваныя вялікай колькасцю праверэраных фактаў, паказам канкрэтных гістарычных падзей і дзейнасцей, станоўць тады значна больш магутнай зброяй і ў барацьбе з буржуазнай гістарычнай навукай.

Між іншым, моцная старана буржуазнай гістарычнай навукі заключалася і заключаецца якраз у ведацці вялікай колькасці фактаў і нам у гэтых адносінах не грэх павучыцца ў буржуазных гісторыкаў*); іх слабая старана заклю-

*) Артыкул з'яўляецца прадмовай да зборніка інстытута гісторыі КП(б)Б, які гэтымі днямі выходзіць з друку.

*) Трэба, зразумела, мець на ўвазе, што побач з патрэбнымі карысными для пролетарыята фактамі гістарычнага мінулага буржуазныя гісторыкі падносілі чытачам і вучням вельмі многа нікчэмнага гістарычнага хламу, або скажалі факты ў адпаведнасці з класавымі інтарэсамі буржуазіі. Гэтаму, натуральна, вучыцца не трэба.

X З'ЕЗДА СОВЕТАЎ БССР

Было-б недапушчальным за колькасным ростам не бачыць тых недахопаў, якія яшчэ ёсць у калгасной жывёлагадоўлі.

Рад калгасаў маюць па дзве і больш фермы. У той-жа час у многіх калгасах няма ферм і абагуленага стада. Паводле даных на 1 жніўня гэтага года з 9.820 калгасаў 930 не маюць абагулненага стада, 5.632 калгасы не маюць абагуленых свіней і 5.090 калгасаў не маюць авечак.

МАШЫНІЗАЦЫЯ І МЕХАНІЗАЦЫЯ СЕЛЬСКАЙ ГАСПАДАРКІ

«Прыдаючы выключна важнае значэнне машына-трактарным станцыям з'езд Саветаў прапануе ўсім совецкім калгасна-кааператыўным органам разгарнуць шырокую палітычна-масавую работу вакол будаўніцтва машына - трактарных станцый, вядучы рашучую барацьбу з недаацэнкай іх арганізуючай ролі ў калектывізацыі сельскай гаспадаркі. З'езд Саветаў даручае ўраду Беларускай ССР і абавязвае ўсе раённыя выканаўчыя камітэты раёнаў дзейнасці машына-трактарных станцый поўнасцю стварыць усе неабходныя ўмовы для паспяховага будаўніцтва машына - трактарных станцый і забяспечыць больш высокія тэмпы калектывізацыі ў раёнах іх дзейнасці, чым у іншых раёнах рэспублікі».

ШТО ЗРОБЛЕНА

У выкананне гэтай дырэктывы X з'езда советаў БССР дасягнута вялікіх поспехаў.

У 1931 г. У БССР БЫЛО ТОЛЬКІ 30 МТС, якія мелі 1.000 трактароў. У 1932 г. колькасць МТС павялічылася да 52 з 1.472 трактарамі. У 1933 г. ужо налічваюцца 63 МТС з 1.683 трактарамі. І, НАРЭШЦЕ, У ГЭТЫМ ГОДЗЕ МЫ МАЕМ 72 МТС З 2.304 ТРАКТАРАМІ. Не лічачы трактароў, якія знаходзяцца ў саўгасах.

З кожным годам павялічвалася насычанасць МТС складаным сельска-гаспадарчымі машынамі. Машына-трактарныя станцыі БССР маюць 3.860 трактарных плугоў, 1.136 сяўбарак, 1.845 барон, 11.434 жняварак-самаскідак, 613 трактарных сенакосілак, 424 трактарных снапавязалак, 1.897 складаных малатарань і г. д. Машынатрактарныя станцыі ўпершыню вяліцэзныя механізацыю ўборкі і апрацоўкі такой працаёмкай культуры, як лён. Уже ў гэтым годзе на палях БССР працавала каля 1.200 льноцэрабілак, якія сябе поўнасцю апраўдалі на справе і якія паказалі высокую прадукцыйнасць працы.

Рост пасеўных плошчаў у раёнах, абслугоўваемых МТС, паказвае зелізярныя вынікі работы трактарнага парка. У 1931 г. калгасамі МТС было засеяна 439,600 гектараў азімых і яравых. У 1932 г. 745.000, а ў гэтым годзе—995.000. Дзякуючы ўдзелу рабоце трактарнага парка МТС засеялі ў гэтым годзе 361.000 гектараў зернавых, 85.271 гектар ільну і 126.000 гектараў бульбы.

У гэтым годзе машынатрактарныя станцыі ўзялі 90.065 гектараў папару і 426.447 гектараў зяблёва.

Такавы лічбы, якія наглядна ілюструюць няўхільнае ўкараненне МТС у сельскую гаспадарку, паступовы рост механізацыі асноўных працэсаў сельскагаспадарчай вытворчасці.

Зараз па БССР налічваецца 6.900 трактарыстаў, 600 трактарных брыгадзіраў і 260 раз'язных механікаў.

Рашаючую ролю ва ўмацаванні МТС і арганізацыйна-гаспадарчым умацаванні калгасаў адыгралі палітаддзелы, арганізаваныя па ініцыятыве тав. Сталіна. Стварэнне палітаддзелаў, разгортванне масава-выхаваўчай работы на вёсцы спрыялі таму, што зоны дзейнасці МТС у большасці раёнаў ішлі ўперадзе па выкананню сельскагаспадарчых кампаній.

Рост калгасаў і соўгасаў, рост машыннай узброенасці сельскай гаспадаркі далі магчымасць значна павялічыць пасеўныя плошчы асноўных культур. Калі ў 1913 г. уся пасеўная плошча складала 2.390 тыс. гектараў, то ў 1933 г. яна дасягнула 3.711 тыс. гектараў.

Побач з агульным уздымам сельскай гаспадаркі, з ростам пасеўных плошчаў узніклася ўраджайнасць нашых палёў. Укараненне агратэхнікі ў сельскую гаспадарку, ранняя тэрміны сяўбы, лепшая апрацоўка глебы далі магчымасць значна павысіць ураджайнасць і разбіць усе довады буржуазных эканамістаў аб беднасці беларускіх палёў.

У 1932 г. з аднаго гектара жыта знімалі 6,3 цэнтн., у 1934 г. адзін гектар даў 9,27 цэнтн. Ураджайнасць ячменю павысілася з 8,27 да 10,63 цэнтн., а аўса з 5,5 да 9,42 цэнтн.

ВЫТВОРЧАСЦЬ ТЭХНІЧНЫХ КУЛЬТУР

«Абавязаць зямельныя органы, калгасную сістэму і раённыя выканаўчыя камітэты поўнасцю выканаць план пасеву вясной 1931 г. 240 тыс. га ільну. Весці і далей работу па будаўніцтву прадпрыемстваў для першапачатковай апрацоўкі сельгаспрадукцыі».

ШТО ЗРОБЛЕНА

Пасеўныя плошчы, занятыя пад асноўнымі тэхнічнымі культурамі, значна выраслі за апошнія гады. У 1934 г. засеяна 249 тыс. гектараў ільну і 26.258 гектараў канопель.

За апошнія тры гады пабудавана 70 льнозаводаў па апрацоўцы ільну, на якіх працуе 3.900 рабочых.

***

Надзвычай вырас матэрыяльны добрабыт калгасных мас. Мы ўжо маем не адзіночныя калгасы, а багацеі, значную большасць, дзе практычна падышлі да вырашэння лозунга тав. Сталіна аб тым, каб зрабіць усе калгасы большавіцкімі, а ўсіх калгаснікаў заможнымі. Гады, якія аддзяляюць нас ад X з'езда советаў, былі гадамі ўпартай барацьбы за перавыхаванне калгаснікаў, за арганізацыйна-гаспадарчае ўмацаванне калгасаў, за выкананне калгаснікамі сваіх абавязацельстваў перад пролетарскай дзяржавай.

Цікава спыніцца на тэмпах і тэрмінах выканання важнейшых сельскагаспадарчых кампаній. Так, у 1931 г. сяўба яравых была закончана 30 чэрвеня, у 1934 г.—25 мая. Уборка ў 1931 г. была закончана 15 верасня, у 1934 г.—10 верасня. Уздым зяблёва ў 1931 г. дацягнуўся да 20 лістапада, у 1934 г. план выкананы 30 кастрычніка.

Загатоўкі хлеба і бульбы ў мінулыя гады зацягваліся да канца года. Так, загатоўкі хлеба ў 1931 г. да канца года былі выкананы толькі на 90,7 проц., а загатоўкі бульбы—на 68,3 проц. У 1934 г. хлебапастаўкі скончаны 5 верасня, а бульбапастаўкі—20 кастрычніка.



Дзяржаўная бібліятэка ў Менску.

КУЛЬТУРНАЕ БУДАЎНІЦТВА

На базе магутнага ўздыму эканомікі ў прамысловасці ў сельскай гаспадарцы гіганцкімі крокам рушылася ўперад нацыянальная па форме і соцыялістычная па зместу культура.

70 проц. няграматнага насельніцтва, ні адной вышэйшай навучальнай установы, ні аднаго навукова-даследчага інстытута — —вось што дасталося нам у спадчыну ад царызма.

Зараз, дзякуючы ленінскай нацыянальнай палітыцы, дзякуючы кіраўніцтву нашай партыі, мы дабіліся сапраўднага трыумфу пролетарскай культуры ў Беларусі. Зараз у БССР працуюць: Акадэмія навук, 38 навукова-даследчых інстытутаў, 18 вопытна-навучальных устаноў, Кансерваторыя, 81 тэхнікум, 76 дзесяцігодак. Створана 7 дзяржаўных тэатраў.

БССР мае сваю развітую пролетарскую літаратуру. Выраслі тыражы газет. Разавы тыраж цэнтральных газет складае 297.500 экземпляраў. Агульны тыраж усіх газет па БССР перавышае 777.000

ПАДРЫХТОЎКА КАДРАЎ СПЕЦЫЯЛІСТАЎ

«Узмацніць тэмпы падрыхтоўкі кадраў спецыялістаў па ўсіх галінах народнай гаспадаркі, культуры і совецкага будаўніцтва».

ШТО ЗРОБЛЕНА

У 1930 г. па БССР налічвалася толькі 3 вышэйшыя навучальныя ўстановы, у якіх вучылася 4.350 студэнтаў.

У 1932 г. УЖО НАЛІЧВАЛАСЯ 27 ВНУ з 7.779 СТУДЭНТАМІ, А Ў 1933 г. — 29, У ЯКІХ НАВУЧАЕЦЦА 9.790 СТУДЭНТАЎ.

ЛІКВІДАЦЫЯ НЯГРАМАТНАСЦІ

«Пацвердзіць пастанову Прэзідыума ЦВК і СНК Беларускай ССР аб поўным сканчэнні работы па ліквідацыі няграматнасці сярод дарослага насельніцтва ад 12 да 45 год у 1932 г.».

ШТО ЗРОБЛЕНА

З краіны няграматнай, з 70 проц. няграматнага насельніцтва БССР становіцца краінай суцэльнай граматнасці. Да Окцябрскай рэволюцыі ў БССР налічвалася грамотных толькі 30 проц. працоўнага насельніцтва. Зараз 96,8 проц. працоўнага насельніцтва ад 12 да 45 год і рабочых членаў профсаюзаў ва ўзросце да 50 год з'яўляюцца пісьменнымі.

УСЕАГУЛЬНАЕ АБАВЯЗКОВАЕ НАВУЧАННЕ

«З'езд прапануе ўраду пачаць разгортванне работы па ўвядзенню абавязковага навучання за семігадовую школу».

ШТО ЗРОБЛЕНА

Ужо ў 1931 г. мы дасягнулі ў БССР поўнага охопу школамі 1-га канцэнтра дзяцей ва ўзросце 10-18 г. Услед за гэтым праведзены мерапрыемствы, якія забяспечылі абавязковае семігадовае навучанне. У 1927-28 г. мы мелі ў пачатковай школе і першым канцэнтры сярэдняй школы 421.565 вучняў, у 1932 г. — 691.033, у 1933 г. у першым канцэнтры сярэдняй і ў пачатковай школе навучалася 631 тыс. дзяцей.

У школах другога канцэнтра ў 1927-28 г. навучалася 56.612 вучняў, У 1933 г. ужо 162.268 вучняў. У трэцім канцэнтры (8 клас) навучаліся першыя 769 чалавек.

ДАШКОЛЬНАЕ ВЫХАВАННЕ

«Узмацніць тэмпы разгортвання дашкольнага выхавання з такім разлікам, каб да канца пяцігодкі давесці охоп дзяцей дашкольнымі ўстановамі не менш як да 50 проц.».

ШТО ЗРОБЛЕНА

У дзіцячых садах і ачагах у 1927-28 г. выхоўвалася 5 тыс. дзяцей, у 1930 г.—10.300, у 1931 г.—21.500, у 1932 г.—40.000.

Дзіцячымі пляцоўкамі было охоплена ў 1930 г.—27000, у 1931 г. — 34.700, у 1932 г.—75.000. Гэтыя лічбы наглядна ілюструюць клопаты нашага ўрада аб дзецях працоўных.

ПАЛЯПШЭННЕ СТАНОЎШЧА ВУЧНЯЎ

«Прымаючы пад увагу тэмпы разгортвання ўсеагульнага навучання, з'езд звяртае асаблівую ўвагу ўрада, а таксама ўсіх цэнтральных і мясцовых органаў і грамадскіх арганізацый на забеспячэнне якасці работы па ўсеагульнаму навучанню (будаўніцтва і рамонт школьных памяшканняў, забеспячэнне вучняў вопраткай, абуткам, гарачымі сняданнямі, інтэрнатамі і навучальнымі дапаможнікамі і прыладамі)».

ШТО ЗРОБЛЕНА

Лічбы паказваюць, што з года ў год расце асігнаванні на забеспячэнне нармальнай работы школ. У 1934 г. адпушчана з цэнтралізаваных фондаў 77.760 пайкоў для вучняў школ прамысловых цэнтраў. Для снабжэння вучняў, што жывуць у інтэрнатах, адпушчана 2.130 пайкоў. Белкавапсаюз у IV квартале г. г. адгрузіў у нізавую гандлёвую сетку розных вопраткі для школьнікаў на 63.300 руб.

Для снабжэння школ падручнікамі, наглядным дапаможнікамі і пісьмовымі прыладамі ў 1933 г. было выдаткавана 1.315 тыс. руб., за 10 месяцаў гэтага года —2.430 тыс. руб. Асігнаванні на лістапад і снежань гэтага года перавышаюць 600 тыс. руб. У 1935 г. праектуецца выдаткаваць 5 млн. руб.

АБ ПАДРЫХТОЎЦЫ ПЕД ГАГІЧНЫХ КАДРАЎ

«Узняць тэмпы падрыхтоўкі настаўніцкага складу масавых школ і палітыка-асветных устаноў».

ШТО ЗРОБЛЕНА

Гэта дырэктыва X з'езда советаў выканана. Мы маем зараз велізарную сетку вышэйшых і сярэдніх педагагічных навучальных устаноў. Беларускі дзяржаўны універсітэт мае 362 студэнтаў, у педагагічных інстытутах навучаецца 3.127 чал., у палітыка-асветным інстытуце—301. У 12 беларускіх педагагічных тэхнікумах навучаецца 4.970 студэнтаў—у двух яўрэйскіх 952, у польскім 224, у рускім 393 чал.

Адкрыццё гістарычнага факультэта БДУ і геаграфічнага факультэта Вышэйшага педінстытута (Менск) павінна адыграць вялікую ролю ў падрыхтоўцы кваліфікаваных педагогаў па гэтых важнейшых дысцыплінах.

ВЫПУСК ПАДРУЧНІКАЎ

«Пашырыць выданне падручнікаў, масавай, палітычнай, тэхнічнай і мастацкай літаратуры на нацыянальных мовах».

ШТО ЗРОБЛЕНА

Калі ў 1931 г. па БССР былі выдадзены 154 назвы кніг на мовах нацменшасцей (яўрэйскай, рускай, польскай), то ў 1933 г. выпушчана 140 назваў з тыражом у 855 тыс. экземпляраў. Асабліва паказальны рост выпуску падручнікаў на мовах нацменшасцей. У 1932 г. тыраж падручнікаў на яўрэйскай мове складаў 97 тыс. экземпляраў, у 1933 г. —283 тыс.; на польскай мове адведна 22 тысячы і 77 тысяч, на нітоўскай — 6 тыс. і 23 тысячы экземпляраў.

***

БССР рашуча разгарнула работу па ахове здароўя. Дырэктывы з'езда советаў аб паляпшэнні абслугоўвання працоўных знайшлі яркае адлюстраванне ў штодзённай практычнай рабоце органаў аховы здароўя. Калі ў 1933 г. былі 173 больніцы на 6.349 коек, дык у 1934 г. іх колькасць павялічылася да 182 з агульным лікам коек у 9.397. Сетка дзіцячай кансультацыі павялічылася з 413 да 569. Беларускі дзяржаўны медыцынскі інстытут штогодна выпускае сотні кваліфікаваных урачоў па усіх медыцынскіх спецыяльнасцях, галоўным чынам для сельскіх і раённых больніц.



Фабрыка «ПІМ», Віцебск.

УЗДЫМ МАТЭРЫЯЛЬНАГА ДОБРАБЫТУ ПРАЦОЎНЫХ

З кожным годам паляпшаецца матэрыяльна-бытавое становішча працоўных. У ажыццяўленне дырэктыў партыі і ўрада прынят рад важнейшых мерапрыемстваў, накіраваных на паляпшэнне ўмоў працы і быту рабочых мас. Значна ўзрасла заработная плата. Сярэдні гадавы заработак рабочага ў 1927-28 г. складаў 536 руб., а ў 1932 г. ужо дасягнуў 1.281 руб. і ў 1933 г.—1.353 руб.

Агульны фонд заработнай платы вырас з 493 млн. руб. у 1931 годзе да 726 млн. рублёў у 1933 годзе.

Вырасці і асігнаванні на соцыяльна-бытавыя патрэбы рабочых. Так, бюджэт соцыяльнага страхавання павялічыўся з 51.324 тыс. руб. у 1931 г. да 85.100 тыс. руб. у 1934 г. Выдаткі соцстраху на розныя прафілактычныя мерапрыемствы перавысілі 3 млн. руб. замест 1.218 тыс. руб. у 1931 г. Сума выдаткаў соцстраху на дзіцячыя яслі дасягнула ў гэтым годзе 2.330 тыс. руб., замест 417 тыс. у 1931 г.

Выдаткі на пенсію складалі ў 1931 г. 7.093 тыс. руб., а ў 1934 г. яны дасягнулі 14.010 тыс. руб.

Гэтыя далёка няпоўныя лічбы выдаткаў на соцыяльнае страхаванне значна павялічваюць заработную плату працоўнага насельніцтва, лішні раз падкрэсліваюць рост яго добрабыту.

РАБОЧАЕ СНАБЖЭННЕ

«Справа бесперабойнага снабжэння рабочага класа і ўсіх працоўных мас з'яўляецца адной з важнейшых задач, і ў гэтай рабоце асаблівую ролю набывае чоткая работа спажывецкай рабочай кааперацыі».

ШТО ЗРОБЛЕНА

У 1932 г. таваразвароты толькі па сістэме спажывецкай кааперацыі складаў 425 млн. руб. Тавараазварот у 1934 г. дасягне 526 млн.—павышэнне на 100 млн. руб. толькі за два гады. Усё больш і больш разгортваецца гандлёвая сетка. На акраінах гарадоў, у глыбінках сельсоветаў пабудаваны і будуюцца новыя магазіны і ларкі. На 1 студзеня 1932 г. па сістэме спажывецкай кааперацыі налічвалася ў гарадах 930 крам і 145 ларкоў і ў вёсцы 3.503 крамы і 207 ларкоў.

За тры гады сетка выраслі: у гарадах — да 960 крам і 315 ларкоў, у вёсцы да 458 крам і 284 ларкі. Гэта толькі па спажывецкай сістэме. Дзесяткі крам ды ў вёсцы, тэм і ў горадзе адкрыта арганізацыямі дзяржаўнага гандлю. Філіялы Белгандля, Белхарчгандля адкрыты ў кожным раёне, у кожным горадзе. У буйных гарадах БССР пабудаваны ўзорна абсталяваныя спецыялізаваныя магазіны, якія гандлююць ля градуктамі харчавання, так і прамтаварамі.

У 1933 г. Сельгаскіраўніцтва Белкавапсаюза мела 60 калгасаў. Пры пасеўнай плошчы ў 9.670 гектараў яны абслугоўвалі 35.600 рабочых. У гэтым годзе пасеўная плошча калгасаў дасягнула 10.326 га, колькасць абслугоўваемых рабочых—37.840. Акрамя таго 70 ТЫС. РАБОЧЫХ у гэтым годзе пры дапамозе прафсаюзных арганізацый засеялі ўласныя агароды, з якіх сабралі сотні і тысячы тон бульбы і гародніны.

СУВЯЗЬ

«...З'езд даручае ўраду ўжыць належныя захады да поўнага ажыццяўлення плана ўстанаўлення тэлефона-тэлеграфнай сувязі цэнтра з раёнамі і раёнаў паміж сабой».

ШТО ЗРОБЛЕНА

Гады, якія прайшлі з часу X з'езда советаў, былі гадамі бурнага росту сувязі.

Калі на 1 студзеня 1931 г. у БССР было толькі 459 паштовых агенцтваў, дык зараз іх налічваецца 1418. Тры гады назад пошта перавозілася аўтамашынамі толькі на адлегласці 775 кілометраў. Зараз пошта даставляецца на аўтамашынах на адлегласці 1125 клм. Колькасць паштовых аўтамашын павялічылася больш чым у два разы. Узнік новы від паштовай сувязі, ня заменна паскараючы даставку газет і пісем—гэта АВІЯПОШТА, якая абслугоўвае лінію працяжнасцю ў 1.000 кілометраў.

У 1931 г. тэлефонамі былі звязаны 241 сельсавет—15,3 проц. У гэтым годзе тэлефанізавана 695 сельсоветаў—больш 60 проц. агульнай колькасці.

Пабудаваны дзве аўтаматычныя тэлефонныя станцыі ў Менску і Магілеве, якія дазволілі павялічыць колькасць абанентаў тэлефонных установак у 3-4 разы.

Нямерна вырасла РАДЫЁСУВЯЗЬ. У пачатку 1931 г. па БССР налічвалося 20 радыёвузлоў з 7913 радыёкропак. Зараз у БССР функцыянуе 88 радыёвузлоў з агульнай колькасцю 34.653 радыёкропак.

Пабудавана магутная 30-ватная радыёстанцыя. Заканчваецца мантаж 100-ватнай радыёстанцыі.

Толькі ў гэтым годзе абсталяваны новыя радыёвузлы ў Камарыне, у Карме, Церахаўцы, Буда-Кашалеве. У лістападзе будзе скончана абсталяванне радыёвузла ў Талачыне — апошнім не радыёфікаваным раёне.

У Доме ўрада абсталёўваецца магутны 200-ватны радыёвузел спецыяльна для абслугоўвання з'ездаў і нарадаў-хвалёвая радыёстанцыя магутнасцю ў 150 ват для ўрадавай сувязі з раёнамі.

***

Аб вялікім размаху соцыялістычнага будаўніцтва сведчыць таксама капіталаўкладанні ў народную гаспадарку, сума якіх за чатыры гады 1931—1934 год па няпоўных даных складае каля 1180,5 рублёў.

залася і заключаецца ў тым, што яны не ўмелі і не ўмеюць сапраўды па-навуковаму абагульніць гэтыя факты, і гэта зусім зразумела, бо буржуазныя гісторыкі не ўладалі і не ўладаюць адзіна навуковым метадам — метадам марксізма.

Як абстаіць справа з выкладаннем і напісаннем гісторыі КП(б)Б у нас, у БССР?

Ці насмелі ў нас для гэтага неабходныя прадпасылкі, ці ёсць у нас для гэтага неабходныя кваліфікаваныя кадры, ці сабраны ў нас і сістэматызаваны неабходныя матэрыялы, ці дастаткова яны праверены, ці дастаткова даследаваны, выкучаны асобныя перыяды ў гісторыі КП(б)Б—вось на якія пытанні мы павінны адказаць для таго, каб вырашыць пытанне — можам мы зараз напісаць гісторыю КП(б)Б або не.

Але зусім бясспрэчна: мы можам і павінны ў самы бліжэйшы час напісаць хоць-бы сцісла падручнік па гісторыі КП(б)Б. Мы непазбаўчальна адсталі ў гэтых адносінах ад іншых рэспублік Совецкага Саюза. Украіна, напрыклад, за перыяд рэволюцыі выпусціла 3 падручнікі па гісторыі КП(б)У, прычым падручнік Папова вышаў ужо VI выданнем, між тым, як у нас да гэтага часу не напісана яшчэ ні адна сур'ёзная кніга па гісторыі КП(б)Б.

З такім становішчам, калі гісторыя КП(б)Б не выкладаецца ні ў адной з школ, ні ў адной з нашых ВНУ — павінна быць пакончана. Мы ва што-б там ні стала павінны навярстаць упушчанае і выпусціць кароткі большавіцкі падручнік па гісторыі КП(б)Б не пазней, чым к 1935-36 навучальнаму году.

Але што значыць навярстаць упушчанае ў пытанні напісання падручніка па гісторыі КП(б)Б?

Гэта значыць—даць такі падручнік па гісторыі КП(б)Б, які быў-бы да канца ва ўсіх сваіх частках большавіцкі вытрыманым, гэта значыць даць такі падручнік, у якім кожная фармуліроўка была-б строга прадумана, кожнае акрэсленне не выклікала-б ніякіх сумненняў, дзе не было-б лішняй славеснай трэскатні і балбатні і дзе марксісцкая тэрміналогія не падмянялася-б ігрой у словцы або расплыўлівым, нічога не гаворачымі паняццямі, запазычанымі з буржуазных кніг і падручнікаў.

У асаблівасці важна, каб у гэтым падручніку атрымалі сваё поўнае і дакладнае выяўленне (і ў сэнсе сутнасці пытання, і ў сэнсе тэрміналогіі) прынцыпы і практыка нацыянальнай палітыкі нашай партыі, накіраванай на збліжэння працоўных розных нацыянальнасцей для сумеснай рэволюцыйнай барацьбы.

Мы павінны даць адразу высокаякасны ва ўсіх адносінах падручнік. Тады гісторыя, калі можна так сказаць, дарве нам наша спазненне.

Што-ж мы маем для выканання гэтай першачарговай задачы якая стаіць перад гісторыкамі КП(б)Б?

Перш за ўсё аб кадрах. Нарэшце, гэты момант з'яўляецца рашаючым. Хто будзе пісаць падручнік? Ці ёсць у нас тэарэтычна моцны і палітычна правераны калектыў гісторыкаў КП(б)Б, які могі-бы выканаць гэту высока-адказную работу?

Нельга сказаць, каб Беларусь магла асабліва пахваліцца і нават колькасцю гісторыкаў КП(б)Б. Старых, «выгадаваных у одных гісторыкаў КП(б)Б—непасрэдных удзельнікаў і творцоў гэтай гісторыі—у самой Беларусі асталіся два-тры чалавекі, астатнія або цалкам пераключыліся на партыйную і совецкую работу, або перабраліся ў другія краі, вобласці, рэспублікі. Частка з іх хоць і прадаўжае цікавіцца праблемамі гісторыі КП(б)Б, але практычна для распрацоўкі гэтых праблем рэбіць вельмі мала.

Але затое ў Беларусі за апошнія гады вырас, праўда, нешматлікі, але тэарэтычна моцны актыў маладых гісторыкаў КП(б)Б, які групуецца ў асноўным (калі не лічыць асобных выкладчыкаў) вакол інстытута гісторыі партыі.

Апіраючыся на рэзервы падрастаючых, але яшчэ не зусім тэарэтычна ўмацаваўшыхся гісторыкаў КП(б)Б, гэты актыў на працягу апошніх 2-3 год даў сур'ёзную па навуковую прадукцыю (рад капітальных зборнікаў, навукова-папулярных брашур, некалькі манаграфій і т. д.).

Мы лічым, што гэтыя наяўныя сілы гісторыкаў КП(б)Б, безумоўна, могуць забяспечыць напісанне большавіцкага падручніка па гісторыі КП(б)Б. Ад гэтых сіл мы павінны толькі патрабаваць творчай лысцыплінаванасці, разумення ўсёй адказнасці за выкананне ў тэрмін даручанай работы, а галоўнае—максімальнай канцэнтраванасці на аснове сапраўднай таварыскай спайкі, без якіх-бы там ні было элементаў сямейнасці, узаемнага недавер'я, нездаровай канкурэнцыі і т. п.

Некалькі слоў аб тэрмінах напісання падручніка па гісторыі КП(б)Б. Ці ёсць у нас магчымасць напісаць і выпусціць яго (падручнік) к 1935-36 навучальнаму году?

Рашаючыя у гэтых адносінах, пры наяўнасці падрыхтаваных кадраў, з'яўляецца пытанне аб матэрыялах і дакументах. Ці чалавек яны ўжо ў больш ці менш сістэматызаваным і зафіксаваным выглядзе, або непасрэдна прыступіць да напісання падручніка, ці не?

На гэта пытанне мы маем усе падставы адказаць станоўча. За час свайго існавання інстытут гісторыі партыі выпусціў 63 работы, у тым ліку такія работы, як «КП(б)Б у рэзалюцыях», пратаколы з'ездаў і канферэнцый (1-ы з'езд, 1,2 і 3 канферэнцыі), «Большавікі—арганізатары Окцябра»—Зюскова, «Окцябр у Полацку»—Прусліна, «Аб развіцці капіталізма ў Беларусі»—Дудкова, «ЛКСМБ у матэрыялах і дакументах» і т. д.

У асаблівасці важна адзначыць, як безумоўны актыў у рабоце Інстытута гісторыі партыі, выпуск апошнім праекта праграмы па гісторыі КП(б)Б і дэтальнага плана падручніка па гісторыі КП(б)Б. Бясспрэчна, і той, і другі дакумент маюць рад сур'ёзных недахопаў, але самы факт іх распрацоўкі з усёй сілай пацвярджае тое палажэнне, што час для напісання падручніка па гісторыі КП(б)Б і напісання яго ў скарочаны тэрмін (прыкладна на працягу бліжэйшага года) паспеў.

Усе тыя ўмовы і магчымасці, якія ў нас ёсць для напісання падручніка па гісторыі КП(б)Б, з'яўляюцца, аднак, «кропляй у моры», калі мець на ўвазе напісанне вялікай навуковай гісторыі КП(б)Б. Да непасрэднага вырашэння гэтай асноўнай важнейшай задачы інстытута гісторыі партыі мы яшчэ не гатовы. Але было-б шкодніцтвам рабіць адсюль выгад, што нам не трэба рыхтавацца да напісання навуковай гісторыі КП(б)Б.

У чым павінна выражацца наша падрыхтоўка да напісання такой навуковай гісторыі КП(б)Б?

Важнейшым крокам у гэтым сэнсе з'яўляецца напісанне падручніка па гісторыі КП(б)Б. Потым наша падрыхтоўка к напісанню навуковай гісторыі КП(б)Б павінна выявіцца ў арганізацыі дапамогі калектыву гісторыкаў партыі, працуючых над навуковай гісторыяй ВКП(б) у Маскве.

Каб зразумець усё значэнне гэтай дапамогі, трэба мець на ўвазе, што недахопам большасці падручнікаў па гісторыі ВКП(б) да гэтага часу з'яўлялася адсутнасць у іх гісторыі нацыянальных кампартый. У вышэйшых падручніках атрымалі сваё адлюстраванне галоўным чынам гісторыі буйнейшых большавіцкіх арганізацый пролетарскіх цэнтраў, або гісторыя цэнтральных органаў нашай партыі. Гісторыі нацкампартый, як такавой, у гэтых падручніках аддавалася вельмі мала месца, і ў асноўным таму, што мы, гісторыкі нацыянальных кампартый, вельмі мала зрабілі для апрацоўкі і сістэматызацыі апрамаднага сырога матэрыяла, які захоўваецца ў нашых архівах.

Далей. Мы павінны зараз-жа зрабіць этабыткам шырокіх колаў гісторыкаў, і не толькі гісторыкаў, рад каштоўнейшых матэрыялаў з мінулага КП(б)Б. Мы павінны выцягнуць з нашых архіваў цэлы рад цікавейшых дакументаў, маючых актуальнейшае палітычнае значэнне, і апублікаваць іх у друку. Трэба думаць, што ў гэтых адносінах значную ролю адыграюць зборнікі Інстытута гісторыі партыі.

Вакол гэтых зборнікаў павінны групавацца тыя непахітныя, на жаль пакуль яшчэ распыленыя кадры гісторыкаў партыі, якія ў нас ёсць, ды, бадай, і не толькі гісторыкаў партыі. Паўтараючы словы П. І. Пакроўскага, мы «павінны ўабудзіць інтарэс к гісторыі ў найшырэйшых масах, зрабіць гэтыя творчыя гісторыю масы выяўнікамі сваёй уласнай творчасці, пачаць пісаць гісторыю рукамі не прафесароў і архівістаў, а рукамі рабочых».

На старонках гэтых зборнікаў павінны абмяркоўвацца ўсе важнейшыя, яшчэ не вырашаныя, але хвалюючыя пытанні гісторыі КП(б)Б. У іх павінны ў поўным парадку друкавацца яшчэ не апублікаваныя дакументы па гісторыі КП(б)Б. У поўным сэнсе гэтыя зборнікі павінны паслужыць тым звяном, за якое павінны ўхапіцца гісторыкі КП(б)Б, каб выцягнуць увесь ланцуг—узяць справу вывучэння гісторыі КП(б)Б на належную навуковую вышыню.

Мы павінны таксама арганізаваць сістэматычнае абмеркаванне на старонках друку, на сходах партактыва, у таварыстве старых большавікоў раду дыскусійных праблем па гісторыі КП(б)Б.

Мы павінны, прымаючы ў Менску, ужо ў гэтым годзе паставіць у нашых буйнейшых ВНУ ўзоры курс гісторыі КП(б)Б. Хіба можна мірыцца з тым, што да гэтага часу ні ў адной з нашых ВНУ, ні ў адной з нашых палітшкол не выкладаецца гісторыя КП(б)Б? І на рэшце, асобую ўвагу мы павінны аддаць справе падрыхтоўкі кадраў для ўзелу у напісанні навуковай гісторыі КП(б)Б і разам з тым выкладчыкаў па гісторыі КП(б)Б у нашых ВНУ.

Сур'ёзным крокам у гэтых адносінах з'яўляецца арганізацыя у бягучым годзе аспірантуры пры Інстытуце гісторыі партыі. Мы, кіраўнікі, не думаем, каб усе 15 аспірантаў, узятых у гэтым годзе з партыйных, савецкай і часткова выкладчыцкай работы, маглі праз тры гады самастойна ўзяцца за напісанне навуковай гісторыі КП(б)Б.

З усёй шчырасцю трэба прызнаць, што па сваёй марксісцкай і агульна - асветнай падрыхтоўцы склад аспірантуры Інстытута не зусім адпавядае тым высокім патрабаванням, якія мы прад'яўляем да паступаючага ў аспірантуру. У гэтым няма нічыёй віны. Гэта хутчэй наша агульная бяда, якая будзе пераможана тым лягчэй, чым хутчэй і па-большэвіцку ўсвядоміць гэта кожны аспірант. Элементы замкнутасці—пераацэнка сваіх здольнасцей і ведаў, якія праявіліся ў свяго-таго з аспірантаў, могуць толькі перашкодзіць іх творчаму росту, перашкодзіць хуткаму перамаганню той культурнай адсталасці, якая, як спадчына праклятага мінулага, ляжыць яшчэ на многіх нас вялікім цяжарам.

Пасля сканчэння вучобы большасць з аспірантаў пойдзе не на навукова-даследчую, а на выкладчыцкую работу, але не можа быць ніякіх сумненняў у тым, што ўсе аспіранты ў той ці іншай меры павінны быць уцягнуты ў справу напісання вялікай навуковай гісторыі КП(б)Б, якая не можа быць творам адной асобы, або нават невялікага калектыва, а творчасцю ўсёй КП(б)Б.

Пры вядомай большавіцкай напорыстасці можна не сумнявацца, што гісторыкі КП(б)Б над кіраўніцтвам ЦК КП(б)Б змогуць да канца перабудавацца ў сваёй рабоце і забяспечыць выкананне ў жыццё гістарычных указанняў Леніна і тав. Сталіна, асабліва ўказанняў аграмадную дапамогу гісторыкам у барацьбе за далейшае развіццё марксіста-ленінскай гістарычнай навукі.

ПРЫЕЗД ЗАМЕЖНЫХ РАБОЧЫХ ДЭЛЕГАЦЫЙ НА ОКЦЯБРСКІЯ СВЯТЫ

НЕГАРЭЛАЕ, 4 лістапада. (Ад спецыяльнага карэспандэнта «Звязды»).

Сёння ў СССР прыехала дэлегацыя рабочых Саарскай вобласці для ўдзелу ў Окцябрскіх урачыстасцях у Маскве. У складзе дэлегацыі — два гарняка, 1 доменшчык і 1 дрэваапрацоўшчык. Трое з іх сацыял-дэмакраты. На чале дэлегацыі т. Матэс — комуніст, доменшчык.

Гэтым-жа поездам прыехалі на Окцябрскія святы адзін амерыканскі марак, адзін рабочы з Паўднёвай Афрыкі і адзін член саюза сацыялістычнай моладзі з Орлеана (Францыя), радыё-электрык Крэтэ, дэлегаваны ад адзінага фронта комсамола і сацыялістычнага саюза моладзі.

У Негарэлым замежным таварышам была наладжана гарачая сустрэча. На лятучым мітынгу прадстаўнікі мясцовых чыгуначнікаў і калгаснікаў віталі прыехаўшых гасцей.

ПРЫГАВОР ВАЕННАЙ КАЛЕГІІ ВЯРХОЎНАГА СУДА САЮЗА ССР ПА СПРАВЕ АБ ВАРАНКОВЕ С. В. АБ ЗДРАДЗЕ РАДЗІМЕ

Ваенная Калегія Вярхоўнага суда Саюза ССР пад старшынствам Матулевіча І. О., разгледзеўшы 4 лістапада 1934 года справу аб Варанкове Сяргеі Васільевічу, былы, чырвонафлотцу лінкора «Марат»,— пастанавіла:

у часе стаянкі лінкора «Марат» у польскім порту Гдыня 7-га верасня 1934 года адзін са знаходзяўшыхся на беразе чырвонафлотцаў Варанкоў Сяргей Васільевіч, 1911 года нараджэння, адмовіўся вярнуцца на карабель і пасля ўходу карабля з гэтага порта астаўся на тэрыторыі Польскай дзяржавы, зрабіўшы тым самым здраду сваёй радзіме.

Ваенная Калегія Вярхоўнага суда Саюза ССР, кіруючыся 319 і 320 арт. арт. крымінальнага-працэсуальнага кодэкса РСФСР і на падставе пастановы Прэзідыума ЦВК СССР ад 21 лістапада 1929 года і пастановы ўрада ад 8 чэрвеня 1934 года аб здрадзе радзіме,

пастаноўляе:

Варанкова Сяргея Васільевіча, як здрадніка радзіме, прыгаварыць к расстрэлу і абвявіць па-за законам.

Сваякоў Варанкова С. В. арыштаваць і аддаць ваеннаму суду.

Належачую яму маемасць канфіскаваць.

За рубяжом

ПАД СЦЯГАМ СОВЕТАЎ—ДА НОВЫХ БАЁЎ

Адозва ЦК компартыі Іспаніі

ПАРЫЖ, 2 лістапада. (Ад перыманага карэспандэнта «Праўды»). Тут атрымана адозва Цэнтральнага Камітэта компартыі Іспаніі да ўсіх рабочых і сялян Іспаніі, Каталоніі, Біскаіі і Галісіі.

Адозва помечана кастрычнікам 1934 г. і напісана на гарачых слядах рэвалюцыйных баёў. Яна змяшчае крытыку тактыкі органаў адзінага фронта — «рабочых альянсаў», куды побач з комуністамі ўваходзілі сацыялісты, а ў асобных месцах і анархісты.

Барацьба за Саар

Францыя перасцерагае фашысцкіх путчыстаў

ПАРЫЖ, 3 лістапада. (Інфармацыя «Праўды»). Увесь друк прысвячае вялікія артыкулы валюхтаючаму плебісциту ў Саарскай вобласці, аддаючы асноўную ўвагу пагрозе нацыянал-сацыялістскага путчу ў Саары.

Напоміўшы, што Совет Лігі нацый раўнуў яшчэ ў 1926 годзе ў выпадку необходнасці гарантаваць свабоду плебісцыта пры дапамозе замежных войск, «Тан» заяўляе: «Калі ў бліжэйшыя месяцы ў Саары адбудуцца беспарадкі, з якімі не змогуць справіцца мясцовыя ўлады, калі саарская ўрадавая камісія скажыстае сваё права звароту за дапамогай да замежных войск, то Францыя павінна будзе адклікнуцца на гэты заклік».

12-ГАДЗІННЫ РАБОЧЫ ДЗЕНЬ У ПОЛЬШЧЫ

ВАРШАВА, 2 лістапада. (БЕЛТА) Вядомая даследчыца пытанняў працы Крагельская ў новай кнізе «Праўда аб становішчы працы ў Польшчы» канстатуе, што ад закона аб 8-гадзінным дні ў Польшчы нічога не асталося. Згодна анкеты, якая ахапляе 124 тысячы рабочых ад 56 да 86 проц. працуюць звыш 8 гадзін у дзень. Работа дзень у 10-12 гадзін — звычайная з'ява. Існуе звычай 16-гадзінны дзень. Крагельская канстатуе, што кожны год на прадпрыемствах Польшчы некалькі сотень людзей пакрыўджаюцца цяжкім і сярэднім раненнем і тысячы гінуць з прычыны адсутнасці элементарнай тэхнікі безапасонасці.

Напярэдадні Окцябра за мяжой

АРЫШТЫ РЭВОЛЮЦЫЙНЫХ РАБОЧЫХ У ВЕНГРЫІ

ВЕНА, 3 лістапада. (БЕЛТА) Як паведамляюць з Будапешта, апасаючыся рэвалюцыйных рабочых сходаў і дэманстрацый у сувязі з 17 гадавінай Окцябра, венгерскія ўлады узмацняюць рэпрэсіўныя меры супроць актывістаў рэвалюцыйнага рабочага руху.

Паліцыя паведамляе аб арышце рабочых Гофмана, Хорвата і Штрэгера, якія характарызуюцца, як «кіраўнікі венгерскай компартыі».

Паліцыя сцвярджае, што Гофман у часе допыту нібы-то выскачыў з акна паліцэйпрэзідыума і забіўся.

ПАВЕДАМЛЕННЕ

Па рашэнню Бюро ЦК КП(б)Б камандзіруюцца для дакладу 6 лістапада аб 17 гадавіне Окцябрскай рэвалюцыі наступныя таварышы:

ГОМЕЛЬ: Добрушская папяровая — Бер, шклозавод — Саевіч, імя Ланцуцкага — Шчэрбакоў, «Пролетарый» — Фішбейн, Гомсельмаш — Выдра.

ВІЦЕБСК: «Сцяг індустрыялізацыі» — Вальфсон, «КІМ» — Агульнік, металургічны — Грыцкевіч (ЦСПСБ).

МАГІЛЕЎ: шаўковая — Чорны, імя Сталіна — Броўковіч, шэйная фабрыка — Поташ.

БАБРУЙСК: лесакамбінат — Ляўкоў, шэйная фабрыка — Левін (гістпарт).

БАРЫСАЎ: «Бярэзіна» — Розін, імя Домбаля — Дружыпоўскі.

ОРША: Белдрэс — Кудзельскі, Асінторф — Каулін, Мясакамбінат — Гурэвіч.

ШКЛОЎ: папяровая фабрыка — Верба.

КРЫЧАЎ: цэментны завод — ВАЛАБРЫНСКІ.

Заг. аддзела культуры і прапаганды ленінізма ЦК КП(б)Б КОНІК.

Адказны рэдактар Н. ЛЕНЦНЕР.

6 лістапада ў 7 гадзін вечара, у памяшканні кінатэатра Дзяржаўнага Тэатра (вул. Валадарскага, 7)

адбудзецца

УРАЧЫСТАЕ ПАСЯДЖЭННЕ ПЛЕНУМА МЕНСКАГА ГАРАДСКОГА СОВЕТА

прысвечанае 17-ай гадавіне Окцябрскай рэвалюцыі.

На пленум запрашаюцца па сваіх мандатах: члены і кандыдаты горсовета, члены ЦК КП(б)Б і ЦК ЛКСМБ, члены ЦВК і СНК СССР і БССР, упаўнаважаныя камісіі партыйнага і савецкага кантролю, члены бюро ГК КП(б)Б і ГК ЛКСМБ, члены прэзідыума ЦСПСБ, члены таварыстваў старых большэвікоў.

Астатнія таварышы праходзяць па спецыяльных запрашальных білетах, якія можна атрымаць у арганізацыйным аддзеле горсовета (пав. № 49, тэлефон № 23-983).

Прэзідыум Менгорсовета.

ПАСТАНОВА

Менскага Гарадскога Совета Рабоча-сялянскіх і чырвонаармейскіх дэпутатаў

4 лістапада 1934 г. *г. Менск*

АБ СВЯТКАВАННІ XVII ГАДАВІНЫ ОКЦЯБРСКАЙ РЭВОЛЮЦЫІ

Менскі гарадзкі совет пастанаўляе:

1. Абавязаць усе прадпрыемствы, установы, прафесіянальныя і кааператыўныя арганізацыі ЖАКТы, ЖБКТ, Жыльветкраўцтва і прыватных дамаўладальнікаў упрыгожыць да 6-га лістапада да 17-ці гадзін вечара іх дамаўладанні сцягамі, лозунгамі і плакатамі.

2. Абавязаць усіх гандляроў магазінаў да 6-га лістапада да 17-ці гадзін упрыгожыць вітрыны магазінаў.

3. Нагляд за выкананнем гэтай пастановы ускладаецца на РС міліцыі.

Старшыня Менскага Горсовета ЖУКОВІЧ.
Сакратар Менскага Горсовета ІПАТАЎ.

Менскі дзяржаўны універсальны магазін
ГАЛОЎНАГА УПРАЎЛЕННЯ УНІВЕРМАГАЎ

НАРКОМУН ГУМ ГАНДЛЮ СССР

адкрыты з 10 гадзін раніцы да 8 гадз. вечара

Адрас: Совецкая, 59, тэл. 25-148.

МАЕ НАСТУПНЫЯ АДДЗЕЛЫ:

1. МЕБЛЕВЫ
2. ФОТО-РАДЫЁ-ЭЛЕКТРО
3. ПАСУДНА-ГАСПАДАРЧЫ
4. СПОРТ І ДАРОЖНЫЯ РЭЧЫ
5. ПАРФЮМЕРЫЯ
6. МУЗЫЧНЫ
7. ДЗІЦЯЧЫ МІР
8. ГАЛАНТАРЭЯ
9. ГАЛОЧНЫЯ ЎБОРЫ
10. БЯЛІЗНА І ТРЫКАТАЖ
11. МАНУФАКТУРА
12. АБУТКОВЫ
13. ФУТРОВЫ
14. ГАТОВАЕ АДЗЕННЕ
15. ПАПЯРОВА - КАНЦЫЛЯРСКІ.

Заўсёды вялікі выбар высокакласных тавараў.

Менскі універмаг пачаў працаваць з 28 мая 1934 г.

Аб рот у тысячах руб.

МАЙ	— 292.700	ПЛАН III КВ.	— 5.800.0
ЧЭРВЕНЬ	— 1.971.700	ВЫКАНАНА	—5.785.100
ЛІПЕНЬ	— 1.894.00	ПЛАН IV КВ.	—6.000.000
ЖНІВЕНЬ	— 0 -5.00		
ВЕРАСЕНЬ	— 1.8 65.800		
КАСТРЫЧНІК	— 2.356.000		

У 1935 г. намячаецца дабудова універмага з пашырэннем плошчы на 175 проц.

Менская міжраённая база БЕЛГАНДЛЯ

АБ'ЯДНАЕ 20 гандлёвых адзінак у Менску і 27 у сельскіх мясцовасцях.

У склад базы ўваходзяць наступныя спецыялізаваныя магазіны: АБУТКОВЫ, ГАТОВАГА АДЗЕННЯ, МАНУФАКТУРНЫ, ФОТАТАВАРАЎ ПАСУДНА-ГАСПАДАРЧЫ, КАНЦ. ПРЫЛАДАЎ, ЛАКА-ФАРБАВЫ, МЕБЛЕВЫ, ШОРНЫ і інш.

За тры кварталы 1934 г. база выканала свой план тавараабароту на 112 %

ПЛАН 14 832 900 р

ВЫКАНАНА 16 616 700 руб.

У ТЫМ ЛІКУ:
АБУТКУ на 1.718 700 р.
ГАТОВАГА АДЗЕННЯ на 2.723 700 р.
МАНУФАКТУРЫ на 4.326.800 р.
ГАЛОШ на 611.400 р
ТРЫКАТАЖ на 1.043.600 р.

МІНІМІЖРАЙБАЗА БЕЛГАНДЛЯ.

БЕЛАРУСКАЯ РЭСПУБЛІКАНСКАЯ КАНТОРА
„САЮЗУЦІЛЬ"

ладзе загатоўку і пераапрацоўку розных відаў уціля і промалыходаў.

Загатоўка вядзецца ў 54 адміністрацыйных раёнах, дзе ёсць 49 загатоўчых пунктаў 5 гарадскіх кантор: у Менску, Гомелі, Віцебску, Магілеве, Бабруйску, а таксама 110 загатоўчых кропак.

У Віцебску ёсць ПРОМУЦІЛЬЗАВОД АТ па пераапрацоўцы рызэя і промалыходаў, якія ў ліквідным выглядзе адгружаюцца прамысловасці і на экспарт.

Белкантора снабжае шляхоўныя фабрыкі, гумовую, коспеапрацоўчую, голевую, каткінаваю прамысловасці і радзіны іншых важнейшых галін прамысловасці як па БССР, так па ўсяму СССР.

За 9 месяцаў 1934 г. Белкантора „Саюзуціль" выканала загатплан у наступнай колькасці

Назва віду сыравіны	План за 9 мес.	Факт. вык.	Проц. вык.
Рызэё	2480 тон	2638	106,8
Косці	1393 „	1407,3	101,1
Гума	335 „	395,4	118,1
Шчаціна	16200 кгр.	16763 кгр.	103,5
Конволас	37500 „	29645 „	79,1
Пух-пяро	33500 „	26179 „	78,4
Рогасыраціна	34000	42107 „	123,8
Каротае залакно	391 тона	121,9 т.	31,2
Метал чорны	1619 „	559,3 „	36,8
„ каляровы	69,2	49,5	71,5
Промалыходы	900 тон	1152 „	120,8
Ільн-ўгары	182 „	265 „	145,6

Загатоўка розных відаў уціля вядзецца Белканторай праз сваіх зборшчыкаў і пра грамадскія арганізацыі.

У 1934 г. Белкантора арганізавала ў вёсцы 20 калгасных дзён па збору уціля. У буйных гарадах вядзецца загатоўка праз ЖАКТы. Усе школы БССР уключаны ў збор уціля. Ёсць цесная сувязь з мопраўскай арганізацыяй і цэнтральным советам сакавіяма і інш., дзе сіламі ячэек пакаёвых арганізацый праводзіцца збор уціля ў карысць калітаняволеных і на пабудову самалёта імя Шмідта.

25 проц. загатоўкі выконваюцца сіламі грамадскасці.

Промфінплан Віцебскага камбіната выканан за III квартал поўнасцю.

БЕЛПЛОДАГАРОДНІНА — саюзнае аб'яднанне Наркомунгандля —

вядзе загатоўкі плодагародняй прадукцыі, бульбы і займенняў іх першапачатковай апрацоўкай, а таксама і арганізацыяй і пастаноўкай узорнай плодагародняй гаспадаркі ў прамысловых гарадах БССР і снабжае плодагароднінай буйнейшыя цэнтры СССР.

Паказальнікі загатовак (у тонах) на 1-XI—34 г. у параўнанні з 1933 г.

НАЗВА ВІДАЎ	1933 г.	1934 г.	Проц
Бульбы	169537	149884	88,4
Гародніны	14756	21047	142,6
Плады семачковыя	1694	8003	472,4
Плады костачковыя	13,2	167	126,4
Мёд у	32,6	30	92,0
Воску	2,9	3	100,1
ВЫВЕЗЕНА ЛЕНІНГРАДУ			
Бульбы	120044	110854	92,3
Гародніны	5349	7433	138,9
ВЫРАБ ЕКА ПРАДУКЦЫІ (у натур. выраж.).			
Сухагародніны	192,2	290,2	150,5
Цеста	495,2	856,7	173
Павідла	102,9	149,3	145
Варэння	39,3	62	157,7
Начынкі	17,9	6,9	38,5
Ягад соўльф	240	241,8	100,7
Сокаў	4,3	18,7	434,8
Агуркоў салёных	1970	1905	139,0
Памідораў салёных	177	340	192,0
Капусты квашанай	888	2551	287,2
Грыбоў салёных	3617	3 8	8,5
Гаматаора	—	59,3	—
УСЯГО У ЦЭН ВЫРАЖ. у тыс. руб (знаменныя цэны 1926-27 г.)	5563	3012	54,1

Гукавы кіно-тэатр „ЧЫРВОНАЯ ЗОРКА"

Ад 5 лістапада

Гукавы мастацкі фільм, прэміраваны на міжнародняй выстаўцы ў Венецыі

Гукавы кіно-тэатр „ПРОЛЕТАРЫЙ"

ПРЭМ'ЕРА!

ТРЫ ПЕСНІ АБ ЛЕНІНЕ

Аўтар-рэжысёр—Д. ВЕРТАЎ.
Вытворч. М. ЖРАБПОМФІЛЬМ.

Кампазітар—ШАПОРЫН.
Аркестр пад кіраўн. БЛОК.

У ПР'ГРАМЕ: Гукавы Совэкінажурнал
ЗА ВАРТА СОЦЫЯЛІЗМА
ПАРАД ВОЙСК МВА.

Паказваецца 4 сеансы
Пачатак у 6, 7-30, 9 і 10-30.
Касы з 1 гадз. дня.

Прымаюцца заяўкі на калектыўныя паходы і мэтавыя сеансы 6, 7 і 8 XI

КІНО „ІНТЭРНАЦЫЯНАЛ" КІНО „СПАРТАК"

ад 6-га ЛІСТАПАДА ДАКУМЕНТАЛЬНЫ ФІЛЬМ

17 З'ЕЗД БОЛЬШЭВІКОЎ
(З'ЕЗД ПЕРАМОЖЦАЎ)

У праграме кіно-хроніка БЕЛДЗЯРЖКІНО, прысвечаная Менскаму Горсовету

СТАЛІЦА БССР ДА XI З'ЕЗДА СОВЕТАЎ

Помяшканне БДТ—1 тэл. 24905

Белдзяржтэатр Оперы і Балета

Мастацкі кіраўнік—заслужаны артыст рэсп. І. А. ГІТГАРЦ

СЁННЯ—спектакль для Белдзяржаўбуда.

6 лістапада—спектакль адміністрацыі.

Білеты, купленыя на 5-XI, аддаюцца на 30-XI—34 г.

Кіно „Інтэрнацыянал" Совэкінажурнал і фільм ПАЭТ І ЦАР

Кіно „СПАРТАК" ВЕЧАР НАВІНАЎ! Тры праграмы і 1 сеанс

Менскі гарадскі саюз спажывецкіх таварыстваў МЕНГОРСПАЖЫЎСАЮЗ

Совецкая, 68, тэл. 21-612
К-К Белканторы Дзяржбанка 91-108

АБ'ЯДНАЕ:

1. Кіраўніцтва гандлёвых прадпрыемстваў.
2. Кіраўніцтва грамадскага харчавання.
3. Кіраўніцтва загатовак і пераапрацовак.
4. Кіраўніцтва сель.-гасп. прадпрыемстваў.

1. Кіраўніцтва гандлёвых прадпрыемстваў
Совецкая, 68, тэл. 21-615
ядае:
Цэнтральную базу-Комсамольская, 28.
Закрытых рабочых кааператываў (ЗРК)—20.
Адкрытых гандлёвых адзінак—130.
Універсальных магазінаў—1. Ленінская, 19.
Спецыялізаваны фруктова-гародніны магазін—1 Ленінская, 1.
„ мяблевы магазін—1. Пляц Волі.
„ пасудна-гаспадарчы магазін—1. Совецкая, 81.
„ галантарэйна-трыкатажны маг.—1. Ленінская, 20.
„ дзіцячы універмаг—1. Ленінская, 1.
„ футровы магазін—1. Ленінская, 12.

2. Кіраўніцтва грамадскага харчавання.
Совецкая, 68, тэл. 23-252.
ядае:
Сталовак—91.
Рэстаран—1. Пляц Волі № 1-4, тэл. 24.700
Кафэ—1. Ленінская.
Падсобныя прадпрыемствы:
Каўбасная майстэрня
Свінаадкормачны пункт.
Трусаводная гаспадарка.

3. Кіраўніцтва загатовак і пераапрацовак.
Вул. Р. Люксембург, тэл. 21-664.
ядае:
Плодагародняю базу,
Сушыльны завод,
Мармеладны завод,
Красільны пункт,
Засолачны пункт,
Завод безалкагольных напіткаў,
Загатоўчыя пункты
4. Кіраўніцтва сельскагаспадарчых прадпрыемстваў
Совецкая, 68, тэл. 21-612.
ядае—11 кааператываў.

ПАКАЗАЛЬНІКІ БЕЛСЕЛЬГАССНАБА ЗА 9 МЕСЯЦАЎ 1934 г.

БЕЛСЕЛЬГАССНАБ снабжае МТС, МТВ, калгасы і соўгасы сістэмы НКЗема БССР прадуктамі вытворчасці—с. г. машынамі і інвентаром, запчасткамі да іх, абсталяваннем для рамонту, рамонтнымі і будаўнічымі матэрыяламі, мінеральнымі ўгнаеннямі і атрутаю.

За 9 м-цаў 1934 г. Белсельгасснаб забяспечыў МТС, соўгасы і калгасы наступнай колькасцю с-г. машын і інвентару:

Плугоў конных розных	18251	Сіласарэзак розных	71	Жняркі-самаскідкі	2568
Баронаў „ „	2424	Сячкарань ручн. і конн.	1926	супроць 3121 у 1933 г.	
„ трактарных	62	супроць 1076 у 1933 г.		Снопавязалкі розныя	101
Культыватараў трактарных	82	„ трактарных	68	Малатарні складан.	157
супроць 41 у 1933 г.		Корнерэзак розных	100	„ конныя	216
Асыпнікаў конных	4894	Бульбамыек	109	завезену ў мінулым годзе не было	
Сявярак трактарных	89	супроць 83 у 1933 г.		Ільномалатарні „Эдзіі"	710
супроць 71 у 1933 г.		Кормазапарнікаў	171	супроць 608 у 1933 г.	
Сеякасілак конных	1364	супроць 138 у 1933 г.		Сартоўкі Кусковта	27
		Грабель конных	543	Ільнаперабілкі шыроказахват.	101

Рост рэалізацыі машын для падрыхтоўкі кармоў у параўнанні з мінулым годам сведчыць аб тым, што БССР праводзіць у жыццё пастановы партыі і ўрада аб развіцці жывёлагадоўлі.

Павелічэнне рэалізацыі трактарных сявярак і культыватараў паказвае аб увазе МТС і соўгасаў да агратэхнікі.

Завезена і рэалізавана вельмі дэфіцытных у БССР жнярак самаскідак больш, чым у 1933 г.

Сярод завезеных с. г. машын упершыню пасядаюць у БССР такія машыны, як складаныя ільномалатарні завода Гомсельмаш, шыроказахватныя ільнаперабілкі, зернасушылкі, новыя балотныя трактарныя плугі і т. д.

БЕЛСЕЛЬГАССНАБ

ПАКАЗАЛЬНІКІ дзейнасці БЕЛРЫБТРЭСТА па гадах па выпуску валавой прадукцыі, капітала, кладанняў і працы

Валавая прадукцыя (карпавая) па рыбгасах Белрыбтраста ў натуральным выразе (у цэнт.

	1932 г.	1933 г.	1934 г. чакаемая	1935 г. план
Рыбгасы	180	1673	2500	2500
Таксама ў цэнах 26-27 г.г.	12,7	117,1	175,0	175,0
Вылаў рыбы па азёрна-рачнай сістэме Белрыбтраста ў натуральным выразе (у цэнтнерах)				
Рыбучасткі	19,815	20.295	25.700	28.000
Таксама ў цэнах 26-27 г.г.	523,1	535,8	670,5	739,2
Рост рабочых па рыбгасах Белрыбтраста.	47	80	89	106
Рост зарплаты рабочых па рыбгасах у проц. к 1932 г.	100	116,6	124,6	137,6
Рост заработы рыбакоў калгасных сістэмы па азёрна-рачнаму лову ў проц. к 1932 г.	100	142	200	200

Капіталаўкладанні па рыбнай прамысловасці Белрыбтраста па гадах (у тыс. руб.)

	1930 г.	1931 г.	1932 г.	1933 г.	1934 г. (чакаемае)
Будаўніцтва навук. дасл. ч.	480	616	1.654	701	700

БЕЛЖЫЛСАЮЗ

ядае 155 ЖАКТ'аў

у 30 гарадах і раённых цэнтрах БССР,

56 будаўнічых мыляўных кааператываў,

9 рэмбудкантор і рэмкантораў,

6 заводаў стандартных дамоў.

З пачатку дзейнасці жыллякаперацыі (1925 г.) да 1932 г. уключна было ўкладзена ў рамонт жыллофонда ЖАКТ'аў 12,7 млн. руб., за 1933 г. у рамонт было ўкладзена 3,6 млн. руб., а ў 1934 г. —6,1 млн. руб.

У будаўніцтва новай жылой плошчы жыллякаперацыя ўкладзена за час сваёй дзейнасці каля 18 млн. руб. і пабудавана каля 120 тыс. куб. метр. новай жылплошчы.

Колькасць членаў ЖАКТ'аў павялічылася ў 8 раз.

Пайвы капітал павялічыўся ў 9 раз.

Агульны гадавы зварот жыллякаперацыі складае 47 млн. руб.

БЕЛЖЫЛСАЮЗ.

МЕНХАРЧГАНДАЛЬ яднае на 1-X-1934 г.

60 ГАНДЛЁВЫХ СПЕЦЫЯЛІЗАВАНЫХ АДЗІНАК.

З іх: хлебных — — 28
мясныя і рыбн. — — 2
гародніны — — 1
бакалайна-кандыт. — 26
фуражных — 7
газавых — — 2
ларкі фруктовых вод 14

Тавараварот у тыс руб.
I кв.—10.852
II кв.—14.386
III кв.—18.321

У продажу: крупа, макароны, хлеб печаны, булкі французскія, баранкі і інш.; масла сліўнае і алей, кансервы сялёдкі, рыба, яечкі, мыла гаспадарчае і туалетнае.

У бліжэйшым часе паступіць у продаж маргарын і сыр галанскі.

Сетка д. кіяскаў IV квартала будзе расширана на два вялікія універсальныя магазіны.

МЕНХАРЧГАНДАЛЬ.

Н. К. Ц. П.
Саюзводстрой
Аддзяленне Усесаюзнай буравой канторы „БУРВОД"
па БССР, Зах. вобл. і Украіне
прымае
СВІДРАВАННЕ КАЛОДЗЕЖАЎ
на воду са сваёй матэрыяльнай базы.
Звяртацца: Гомель, вул. Леніна, 16, „Бурвод".

Кіраўніцтва мастацкіх і навучальных прадпрыемстваў БССР выказваюць сваё спачуванне тэатру юнага гледача і сямі і сваякам на нечакана заўчасны смерці актрысы тэатра—

Зінаіды Іванаўны АБРАМОВІЧ

Калектыў і дырэкцыя Беларускага Дзяржаўнага Тэатра юнага гледача з вялікім жалем паведамляюць аб смерці старшынькі, таварышкі па працы

Зінаіды Іванаўны АБРАМОВІЧ

Пахаванне адбудзецца 5-XI. Выхад цела з 2-ой совецкай больніцы у 11 г. раніцы.

Менск, друкарня «Звязды». Выпускаючы—КРУЧКОЎ, ст. карэктар — БЯРОЗАВІК, ст. метранпаж — Н. ПЕРАКЛАДНЕЎ, ст. стэрэатыпёр — КАГАН Е., ст. друкар — АНУЧЫН. Уп. Галоўлітбела № К—3288.